Таямніцы пітной вады

Калодзеж, дай напіцца

Рэлакс па-беларуску

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Таццяна САЙГАНАВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах:

«Парламентарыі рыхтуюць да першага чытання на восеньскай сесіі законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Банкаўскі кодэкс Беларусі. Акцэнт у ім зроблены на пытаннях абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг. Так, чалавек, які атрымаў крэдыт, на працягу 14 каляндарных дзён зможа датэрмінова яго вярнуць, пагасіць цалкам або часткова, не паведамляючы пры гэтым папярэдне крэдытадаўцу. Частка паправак закліканая ліквідаваць пытанні, звязаныя з выкананнем банкам сваіх абавязацельстваў пасля адклікання ў яго ліцэнзіі на банкаўскую дзейнасць. Змяняецца чарговасць задавальнення патрабаванняў укладчыкаў і іншых крэдытораў банка. Першымі будуць фізасобы, уладальнікі аблігацый і арганізацыі, якія ажыццяўляюць гарантаванае вяртанне банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.08.2017 г.

Долар ЗША	1,9537	▲
Еўра	2,2943	▼
Рас. руб.	0,0325	▲
Укр. грыўня	0,0759	▲

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№152 (28516)

10 ЖНІЎНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12

Братэрства сямейнае і хлебнае

Фота БЕЛТА.

Гэтыя моцныя, вельмі падобныя адзін на аднаго хлопцы — родныя браты Міхаіл і Сяргей БАРАНОЎСКІЯ. Але яднае іх не толькі сям'я, але і хлебнае поле: Сяргей — камбайнер, Міхаіл — трактарыст, адвозіць зерне на збожжаток. Яны ў ААТ «Сінпольскае» Лельчыцкага раёна лідары жніва. Дарэчы, гаспадарка ўжо выканала план па здачы збожжа па дзяржзаказе і цяпер здае фуражнае зерне.

■ На слыху

Падручнік — не навуковы трактат

Як плануюць змагацца з перагрузкай школьнікаў?

Новыя падручнікі з тэхналогіяй дапоўненай рэальнасці могуць з'явіцца ў Беларусі. Пра гэта падчас правядзення круглага стала ў БЕЛТА паведаміла намеснік дырэктара па навукова-метадычнай рабоце Нацыянальнага інстытута адукацыі Валянціна ГІНЧУК.

Беларускі кантэнт

У наступным навучальным годзе ў адукацыйным працэсе будзе выкарыстоўвацца 41 новы вучэбны дапаможнік, 19 з іх ужо выдадзены. Яшчэ 11 выдадуць да 1 верасня. Астатнія навучальныя дапаможнікі (пераважна гэта другія часткі падручнікаў), будуць выкарыстоўвацца толькі ў II паўгоддзі, таму выдавацца яны будуць да снежня. Большасць новых навучальных дапаможнікаў трапяць да вучняў трэціх і сёмых класаў. У першых класах — новыя буквары. У беларускамоўных школах з'явіцца новы буквар Анатоля Клышкі. А ў рускамоўных першакласніці будуць вучыцца грамаце па буквары Вольгі Цірынавай. Па гэтых вучэбных дапаможніках праводзіўся конкурс. Абодва аўтары ў ім перамаглі.

Па словах Валянціны Гінчук, беларускаму кантэнту ў новых падручніках удзяляецца асаблівая ўвага:

— Адметнасцю новых навучальных дапаможнікаў з'яўляецца ў тым ліку іх нацыянальна арыентаваны змест. Мы рэкамендуем аўтарам пры распрацоўцы навучальных дапаможнікаў уключаць тэксты пра дасягненні беларускай прамысловасці, помнікі культуры, перамогі нашых спартсменаў і інш. Сам факт інфармавання пра гэта мае выхаваўчае значэнне. Напрыклад, у новым навучальным дапаможніку па гісторыі Беларусі для 6-х класаў з'явілася рубрыка «Гістарычныя славутасці». Яна знаёміць навучэнцаў і апасродкавана іх бацькоў з тымі помнікамі гісторыі, культуры, архітэктуры, якія захаваліся да нашага часу. Адпаведная рубрыка будзе прадстаўлена і ў новым навучальным дапаможніку па гісторыі Беларусі для 7-х класаў. Мяркуецца, што яна стане традыцыйнай ва ўсіх навучальных дапаможніках па гісторыі Беларусі.

Таксама новыя падручнікі і навучальныя дапаможнікі будуць уключаць больш практыка-арыентаваных заданняў. Настаўнік матэматыкі Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча, аўтар вучэбнага дапаможніка па матэматыцы для 7-га класа Ірына Арэф'ева расказала, што пры рабоце над падручнікам неабходна было прытрымлівацца класічных падыходаў да вывучэння матэматыкі (усе лепшыя напрацоўкі папярэдніх аўтараў былі захаваныя), але ў той жа час старацца адаптаваць вучэбны матэрыял да сучаснасці. Сур'ёзную работу правялі ў дачыненні да тэкставага кантэнту. Падбіралася літаральна кожнае слова, каб тэорыя была максімальна даступнай для школьнікаў. У кожным параграфе падручніка прадугледжаны раздзел «Практыка», дзе прыводзіцца падрабязнае рашэнне тыпавых задач па вывучанай тэме.

СТАР. 4

■ Жніво-2017

ПАКАЗЧЫКІ — НА ВЫШЫНІ!

Айчынныя аграрыі намалацілі больш за 3 мільёны тон збожжа

Такая лічба з'явілася ў зводцы аператыўнай інфармацыі на сайце Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Па стане на 9 жніўня, усяго ў Беларусі было намалочана 3,175 мільёна тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці ў 35,6 ц/га.

Лідарам па намалоце з'яўляецца Брэсцкая вобласць — яе работнікі дасягнулі паказчыка ў 880,6 тысячы тон пры сярэдняй ураджайнасці ў 37,1 ц/га. Следам ідзе Мінская вобласць, аграрыі якой намалацілі 681,7 тысячы тон пры сярэдняй ураджайнасці ў 37,2 ц/га. Трэцяе месца сярод беларускіх рэгіёнаў займае Гомельшчына — тут сабралі 572,4 тысячы тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці ў 28,9 ц/га.

Работнікі Гродзенскай вобласці па стане на ўчарашні дзень намалацілі 539,3 тысячы тон збожжа пры самай высокай ураджайнасці ў краіне ў 44,3 ц/га, тады як у Магілёўскай вобласці паказчыкі складаюць 341,8 тысячы тон пры сярэдняй ураджайнасці ў 34,4 ц/га. Апошнім рэгіёнам, які ўключыўся ў жніво, стала Віцебская вобласць, аграрыі якой убралі 159,3 тысячы тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці ў 31,4 ц/га.

Што да збожжавых і зернебабовых, то яны сабраны з 891 тысячы гектараў, што складае 41% ад усёй уборачнай плошчы. Па гэтым паказчыку таксама лідзіруе Брэсцкая вобласць, дзе аграрыі ўжо прыбралі 71,1% плошчаў. Следам ідзе Гомельская вобласць, работнікі якой апрацавалі ўжо 55,9% плошчаў. Трэцяе месца займае Гродзенская вобласць з паказчыкам у 38,1%.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ. *lukashevich@zviazda.by*

■ Прызначэнне

ЭФЕКТЫЎНАЯ РАБОТА — ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА

Цяпер яна стаіць перад новым кіраўніком Аршанскага райвыканкама

Поспех раёна залежыць ад таго, як працуе яго кіраўнік, наколькі дакладна разумее тыя задачы, што стаяць перад ім і даверaным яму рэгіёнам. Такую думку выказала Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, якая прадставіла актыву Аршанскага раёна новага старшыню райвыканкама Аляксандра Пазняка. На пазачарговай сесіі Аршанскага райсавета ён быў зацверджаны на гэтай пасадзе. Перад гэтым Аляксандр Пазняк быў памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Віцебскай вобласці.

Наталля Качанава падкрэсліла, што задачы, пастаўленыя перад раёнам, застаюцца ранейшыя. «Гэта эфектыўная работа кожнага прадпрыемства і эфектыўная работа раёна ў цэлым. Аршанскі раён павінен быць прыкладам у рэгіянальным развіцці для гарадоў і раёнаў краіны. Пастаўлена задача на прыкладзе Оршы паказаць, як можа развівацца горад і раён. Як эфектыўна могуць працаваць прадпрыемствы, арганізацыі, установы для таго, каб фарміраваць бюджэт, вырашаць сацыяльныя задачы», — сказала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Яна адзначыла, што кадры іграюць ключавую ролю ў арганізацыі працы прадпрыемстваў і раёнаў. У гэтым кантэксце надзвычай важная роля кіраўніка. «Калі кіраўнік на сваім месцы, ён разумее тыя задачы, якія стаяць перад ім, ён умее працаваць з людзьмі, — усе праблемы вырашальныя. Бываючы ў рэгіёнах, я бачу, што ў адной і той жа эканамічнай сітуацыі прадпрыемствы працуюць па-рознаму. Там, дзе сапраўды добра працуе кіраўнік, ёсць поспех і ў прадпрыемства. І прыкладаў таму шмат у нашай краіне, і ў Оршы такіх дастаткова», — адзначыла Наталля Качанава.

У сваю чаргу Аляксандр Пазняк падкрэсліў, што магутныя прамысловыя прадпрыемствы Аршанскага раёна, на жаль, не маюць выразнага плана развіцця. «Неабходна выпрацаваць стратэгію для кожнага завода і ўсёй прамысловасці ў цэлым. Я яе бачу ва ўзаемасувязі з сельскай гаспадаркай, таму што, напрыклад, «Оршааграпраммаш» можа эфектыўна працаваць і прыносіць выгаду раёну, Віцебскай вобласці, краіне. Менавіта ў развіцці ўзаемасувязі сельскай гаспадаркі і прамысловасці я бачу кропку прыкладання сіл», — паведаміў Аляксандр Пазняк.

Кажучы аб сельскай гаспадарцы, новы кіраўнік раёна адзначыў ужо існуючы высокі ўзровень земляробства. «Аршанскі раён у адрозненне, напрыклад, ад Расонскага або Шаркаўшчынскага, досыць лаяльны да сельскагаспадарчых культур. Добры ўраджай — гэта вынік высокай бальнасці зямель і ўкладзенай працы людзей, — падкрэсліў Аляксандр Пазняк. — Але для раёна, як і для ўсёй вобласці, актуальная задача, якую паставіў Прэзідэнт на селектарнай нарадзе, — трэба перагледзець структуру пасяўных плошчаў. Тут павінна апрацоўвацца тая культура, якая дае максімальную аддачу. Акрамя гэтага, для збожжавых павінен выконвацца аптымальны севазварот. Усё гэта дасць вынік, і я ўпэўнены, што Аршаншчына стане лідарам».

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

■ Ва ўрадзе

ПАЛІВАМ ЗАБЯСПЕЧАНЫ

Прэм'ер-міністр наведаў з рабочай паездкай Гомельскую вобласць

У адпаведнасці з даручэннямі Прэзідэнта, дадзенымі 2 жніўня на рэспубліканскай селектарнай нарадзе па пытаннях уборкі ўраджаю, урад падрыхтаваў шэраг прапаноў па матэрыяльным аснашчэнні жніва, у першую чаргу па забеспячэнні гаруча-змазачнымі матэрыяламі.

«Кіраўнік дзяржавы падтрымаў нашу прапанову аб выдзяленні сельгасарганізацыям 50 тысяч тон паліва ў выглядзе таварнага крэдыту. Гэта прыкладна на 17 дзён працы, гэта значыць, яго хопіць да 18—20 жніўня», — адзначыў **прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ** учора падчас рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць. Прычым гэтага аб'ёму з улікам паліва, якое маецца ў саміх гаспадарках, будзе дастаткова, каб праводзіць увесь комплекс сельгасработ, уключаючы нарыхтоўку кармоў і сяўбу азімых.

У цяперашні час урад рыхтуе яшчэ адно рашэнне, якое датычыцца выдзялення паліва пад забеспячэнне ўборачных і іншых работ. «Ёсць магчымасць, з улікам вяртання часткі паліўнага крэдыту, вылучыць аграрыям яшчэ 21 тысячу тон. Мы разлічваем пачаць гэтыя пастаўкі ў канцы жніўня—пачатку верасня», — сказаў кіраўнік урада.

Што да сітуацыі з уборкай збожжавых у краіне, то яна, на думку прэм'ер-міністра, у цэлым развіваецца нармальна. «Ёсць усе ўмовы для завяршэння асноўных работ да 20 жніўня», — запэўніў Андрэй Кабякоў.

Акрамя таго, падчас паездкі абмяркоўвалася тэма фінансавага аздараўлення прадпрыемстваў аграрнага сектара. Па словах прэм'ер-міністра, яно будзе праводзіцца сістэмна і комплексна.

Сітуацыя з фінансавым аздараўленнем гаспадарак Гомельскай вобласці ў бягучым годзе, на думку кіраўніка ўрада, у цэлым станоўчая. У прыватнасці, у Гомельскім рэгіёне на 1 студзеня 2017 года была вызначана 41 неплацежаздольная гаспадарка. Па інфармацыі аблвыканкама, на 1 ліпеня 15 гаспадарак з гэтага ліку змаглі аднавіць плацежаздольнасць, 19-палепшылі свой фінансавы складнік, але яшчэ не дасягнулі ўзроўню плацежаздольнасці. І толькі ў дзвюх арганізацыях сітуацыя пагоршылася, што запатрабуе прыняцця дадатковых мер.

Як вядома, кіраўнік дзяржавы даў даручэнне правесці ў найбліжэйшы час нараду па праблемах АПК. Тэма аздараўлення сельгаспрадпрыемстваў будзе на ёй адной з ключавых. «Думаю, што да моманту яе правядзення ў нас будзе што далажыць Прэзідэнту, прапанаваць вырашэнне тых праблем, якія пакуль ёсць», — сказаў прэм'ер. Разам з тым не варта забываць, што станоўчы эфект мер па фінансавым аздараўленні прадпрыемстваў аграрнага сектара магчымы толькі пры ўмове навядзення парадку, адпаведнага ўзроўню дысцыпліны, а таксама ўкаранення перадавых тэхналогій. «На гэта мы будзем нацэльваць органы мясцовай улады, а таксама кіраўнікоў сельскай гаспадаркі рознага ўзроўню», — адзначыў ён.

У ходзе рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць прэм'ер-міністр азнаёміўся з вынікамі работы сельскагаспадарчых арганізацый рэгіёна, у прыватнасці Жыткавіцкага раёна, па ўборцы збожжавых і зернебабовых культур, нарыхтоўцы кармоў. Андрэй Кабякоў наведаў Тураўскі малочны камбінат, дзе былі разгледжаны пытанні фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства і рэалізацыі інвестпраекта «Будаўніцтва малочнага камбіната ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці, 2-гі этап». Ён таксама пабываў на шэрагу вытворчых аб'ектаў ААТ «Тураўшчына», у тым ліку малочнатаварным комплексе, гароднінасадавінасховішчы, аграсядзібе «Струмень», дзе яму далажылі аб прымаемых мерах па развіцці жывёлагадоўлі, плодаагародніцтва, аграэкатурызму ў Гомельскай вобласці і Жыткавіцкім раёне ў прыватнасці.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by



Дарогу — маладзёжным экіпажам

На палях сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і арганізацый у час уборачнай кампаніі працуюць 1042 маладзёжныя экіпажы камбайнераў. На адвозцы збожжа задзейнічана 789 маладых кіроўцаў. У Брэсцкай вобласці — 115 маладзёжных экіпажаў, 167 маладых кіроўцаў, у Віцебскай — 173 экіпажы, 107 кіроўцаў, у Гомельскай — 107 экіпажаў, 102 кіроўцы, у Гродзенскай — 164 экіпажы, 123 кіроўцы, у Мінскай — 216 экіпажаў, 146 кіроўцаў, у Магілёўскай — 156 экіпажаў, 75 кіроўцаў, расказалі ў Беларускім рэспубліканскім саюзе моладзі.

Традыцыйна ва ўсіх рэгіёнах краіны сярод маладзёжных уборачных экіпажаў і маладых кіроўцаў, занятых на адвозцы збожжа пры ўборцы збожжавых і зернебабовых культур, арганізаваны спаборніцтвы. Пераможцамі ў намінацыях «Маладзёжны экіпаж камбайнераў, які дасягнуў найбольшага намалоту», «Малады кіроўца, які перавёз найбольшую колькасць збожжа» становяцца, як першыя экіпажы-тысячнікі, так і экіпажы, і кіроўцы, якія занялі прызавыя месцы ў працоўным спаборніцтве па выніках уборачнай кампаніі. Бацькам маладых механізатараў і кіроўцаў, якія асабліва праявілі сябе падчас уборачнай кампаніі, ГА «БРСМ» накіруе падзячныя лісты за годнае выхаванне сыноў і дачок, прывіццё ім любові да працы і роднай зямлі.

Свой уклад у харчовую незалежнасць Беларусі ўносяць і сельскагаспадарчыя атрады. Тэрытарыяльныя штабы студэнцкіх атрадаў БРСМ заключылі з прадпрыемствамі аграрнага комплексу дагаворы на работу 173 студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў агульнай колькасцю 4 217 працоўных месцаў. У жніўні—верасні асноўнымі відамі сельскагаспадарчых работ, якія выконваюцца байцамі такіх атрадаў, з'яўляюцца ўборка сельскагаспадарчай прадукцыі, лёну і праца на зернесушыльных комплексах.

Паводле звестак Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ, на 1 жніўня ў складзе 133 студэнцкіх атрадаў сельскагаспадарчага профілю працаўладкавана 1670 юнакоў і дзяўчат.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Пад Парыжам аўтамабіль урэзаўся ў групу ваенных

У адным з прыгарадаў Парыжа — Левалуа-Пэры, размешчаным на паўночным захадзе французскай сталіцы, у групу ваеннаслужачых урэзаўся аўтамабіль BMW. Па паведамленнях відавочцаў, паранены шэсць чалавек. Паводле інфармацыі тэлеканала BFM TV, аўтамабіль наляцеў на салдат, калі тыя выходзілі з казармы. «Гэта, несумненна, наўмысны акт», — заявіў у інтэрв'ю тэлеканалу кіраўнік раённай управы Левалуа-Пэры Патрык Балканах. У Францыі з 2015 года дзейнічае рэжым надзвычайнага становішча. Ён быў уведзены пасля серыі тэрактаў 13 лістапада 2015 года ў Парыжы, ахвярамі якіх сталі 130 чалавек, яшчэ больш за 350 атрымалі раненні.

Устаноўчы сход Венесуэлы аб'явіў сябе галоўным органам улады ў краіне

Кіраўнік Нацыянальнага ўстаноўчага сходу (НУС) Дэлсі Радрыгес заявіла, што з гэтага моманту ніводная галіна ўлады ў краіне не зможа ніякім чынам перашкаджаць рашэнням новага заканадаўчага органа. «Гэты закон — магутны інструмент для таго, каб задушыць гвалт, нянавісць і нецярпімасць», — заявіла Радрыгес, якая раней узначальвала венесуэльскае МЗС. Як вядома, Нацыянальны ўстаноўчы сход (канстытуцыйная асамблея) — орган, што быў сфарміраваны па выніках выбараў, якія прайшлі ў Венесуэле 30 ліпеня.

Улады ЕС гатовы пачаць разбіральніцтва па справе аб атручаных яйках

Крыніцай інсектыцыду фіпранілу лічыцца кампанія з Нідэрландаў. Ва ўрадзе Германіі падазраюць, што меў месца злосны намер. «Неабходна правяраць усю Еўропу, і калі за гэтым стаіць злачынная сетка, то варта ўмяшацца і ўраду, і пракуратуры», — заявіў міністр сельскай гаспадаркі ФРГ Крысціян Шміт. Заражаныя фіпранілам яйкі паспелі патрапіць на прылаўкі ў Нідэрландах, Бельгіі, Германіі, Францыі і Вялікабрытаніі. Паведамляецца, што ўсю падазроную прадукцыю ўжо канфіскавалі.

Курс біткоіна абнавіў гістарычны максімум

Курс біткоіна днямі пабіў чарговы гістарычны максімум, перавысіўшы адзнаку ў 3400 долараў. Такім чынам, капіталізацыя крыптавалюты дасягнула $55,6 млрд. Бягучы рост біткоіна, верагодна, звязаны са станоўчай рэакцыяй удзельнікаў рынку на змены, якія адбыліся. 1 жніўня абнаўленне пратакола найстарэйшай і найбольш вядомай крыптавалюты прывяло да з'яўлення новай, якая атрымала назву Bitcoin Cash. Гэта адбылося з-за таго, што частка ўладальнікаў біткоіна прапанавала замяніць існуючы пратакол на новы SegWit2x. Замена павінна дапамагчы павялічыць хуткасць транзакцый і паменшыць памер камісіі за гэтыя аперацыі. SegWit2x падтрымалі 85% сусветнай супольнасці ўладальнікаў біткоіна. У той жа час кіраўніцтва некаторых электронных плацежных сістэм, уключаючы Coinbase, BitMEX і Bitstamp, заявіла, што не збіраецца падтрымліваць другую крыптавалюту.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Шануючы традыцыі, кіраўнікі Выдавецкага дома «Звязда» ўсклалі кветкі да памятных знакаў, якія ўшаноўваюць подзвіг звяздоўцаў у гады вайны.

■ Парламенцкі дзённік

ПАМЯЦЬ ЖЫВЕ

Учора члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Васіль Бараннік, Адам Кавалька і Валянціна Ражанец усклалі кветкі да помніка Герою Савецкага Саюза Уладзіміру Амельянюку, які рэдагаваў «Звязду» ў 1942 годзе.

Помнік знаходзіцца каля Чырвонага касцёла ў Мінску. На гэтым месцы ў маі 1942-га адважны падпольшчык і журналіст быў забіты... Але памяць пра яго жыве, у тым ліку сярод мінчан: адна са сталічных вуліц названа яго імем.

Члены Палаты прадстаўнікоў успомнілі доўгі шлях, які газета «Звязда» прайшла разам са сваімі чытачамі: падчас вайны клікала на барацьбу з ворагам, пасля — аднаўляла гаспадарку. Сёння газету «Звязда» і Палату прадстаўнікоў аб'ядноўвае шматгадовае дзелавое супрацоўніцтва.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

АДЗНАЧЫЛІ 100-ГОДДЗЕ ДЫКТОЎКАЙ

Шэраг юбілейных падзей стаў нагодай для незвычайнага мерапрыемства, якое адбылося ўчора ў Дзяржынску. Цэнтральная раённая бібліятэка і райкам БРСМ правялі дыктоўку, прымеркаваную да 100-годдзя «Звязды», 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама Года навукі. Нашы карэспандэнты завіталі на імпрэзу і праверылі сваё веданне роднай мовы разам з жыхарамі Дзяржыншчыны.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Мы штогод праводзім падобныя дыктоўкі на Дзень роднай мовы, — расказвае **першы сакратар Дзяржынскага раённага камітэта БРСМ Кірыл ШЫК**. — Але сёлета Беларусь адзначае адразу некалькі круглых дат, таму вырашылі правесці яшчэ адно дадатковае мерапрыемства летам. Пераможцаў вырашылі ніяк не адзначаць — гэта, хутчэй, яшчэ адна магчымасць успомніць пра родную мову, а не праверыць уласнае веданне беларускай арфаграфіі ці пунктуацыі. Сутнасць мерапрыемства — далучыцца да агульнай стваральнай справы і адсвяткаваць знакавыя падзеі ў гісторыі нашай культуры, убачыць, што ты не адзін у сваёй любові да беларускага.

Для дыктоўкі быў выбраны ўрывак з апавядання Якуба Коласа «Крыніца» з цыкла твораў «Казкі жыцця» — як лічаць арганізатары, узор беларускага красамоўства. Нягледзячы на летні час, у чытальнай зале бібліятэкі вольных месцаў не было. Сярод удзельнікаў хапала і моладзі.

— Я даведалася пра дыктоўку на сайце горада, — расказвае **навучэнка 10 класа дзяржынскай гімназіі №3 Ганна КРЫВІЦКАЯ**. — Старэйшая сястра прапанавала прыйсці і праверыць сваё веданне роднай мовы, я згадзілася. Маю добрыя адзнакі па беларускай мове ў гімназіі, але, шчыра кажучы, маўленчай практыкі мне нестае, бо ў сям'і і маім акружэнні ўсе размаўляюць па-руску. Таму такая дыктоўка не будзе залішняй.

— Безумоўна, я вельмі ўдзячны тым, хто прыдумаў гэта мерапрыемства, — кажа **гісторык, паэт, член літаратурнага аб'яднання «Выток» Антон АНІСОВІЧ**. — Напэўна, не буду арыгінальным, калі скажу, што яно вельмі важнае для папулярызацыі нашай мовы, яе прапаганды ў добрым сэнсе гэтага слова. Тым больш мне прыемна бачыць сярод удзельнікаў моладзь — гэта значыць, што моўная сітуацыя ў Беларусі рухаецца да лепшага. У нашай бібліятэцы праводзіцца цэлы шэраг падобных мерапрыемстваў, і хочацца спадзявацца, што з гэтага будзе плён. Са свайго боку заўважу, што ў наша аб'яднанне за апошні час прыйшло шмат маладых аўтараў — гэта вельмі ўсцешвае.

Прызнаемся, што дыктоўка была далёка не простай — кожнаму ўдзельніку прыйшлося прыгадаць школьныя гады (ці часова вярнуцца з канікулаў). Напрыканцы супрацоўнікі бібліятэкі прачыталі ўрывак з усімі дэталямі і растлумачылі ўдзельнікам памылкі. Па заканчэнні дыктоўкі ўсе атрымалі на памяць свежыя нумары «Звязды».

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Сто мецэнатаў і ідэй

Як звяздоўцы юбілей святкавалі

Калектыў «Звязды» — гэта сям'я. Таму і юбілей газеты святкавалі ўчора па-сямейнаму, маючы на ўвазе, што афіцыйныя святочныя мерапрыемствы яшчэ наперадзе. Каб успомніць, якім было жыццё звяздоўцаў у гэтыя сто гадоў, у фае рэдакцыі зладзілі фотавыставу з асабістых архіваў. Камандзіроўкі, прэс-канферэнцыі, уручэнне прызоў, карпаратывы, пікнікі на прыродзе — хіба ўсё ўспомніш?

За музыку на нашым святе адказваў... дудар! А як яшчэ можа быць у найстарэйшай беларускай газеце? Дудар Антон Бельскі іграў так гучна, што, упэўнены, усе калегі з Дома прэсы ведалі — не, чулі — як звяздоўцы адзначаюць юбілей. Танцы таксама былі — беларускія. Журналісты, карэктары, рэдактары разбіліся па парах і развучылі польку «Бабачку».

І якое ж свята без торта? 10-кілаграмовы дэсерт (*на фота*) для нас пякла сапраўдная чэмпіёнка. Па кандытарскім майстэрстве, вядома. Майстар-кандытар Ірына Шмуляўцова (КВУП «Мінскхлебпрам», хлебазавод №5), якая старалася зрабіць наш юбілей салодкім, летась яны разам з кандытарам Святланай Аляшкевіч атрымалі «золата» на Сусветнай кулінарнай алімпіядзе ў Эрфурце (Германія). Нават кіраўнік прадпрыемства Андрэй Барысаў прымаў удзел у распрацоўцы дызайну святочнага пачастунку.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У гэту знакавую дату мы шмат чаго сабе жадалі. Сто мецэнатаў, сто ідэй, 100-працэнтнага здароўя, тыраж у сто тысяч экзэмпляраў... А галоўнае, каб нашы любімыя чытачы і надалей заставаліся з намі і адчувалі сябе на ўсе 100!

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@azviazda.by*

«Звязда» на ўсё жыццё

Ветэраны нашай газеты, якія сабраліся ўчора ў рэдакцыі, падзяліліся з маладымі супрацоўнікамі сваім вопытам, прыгадалі шмат гісторый і жартаў

Яны сышліся быццам бы на вечары сустрэчы выпускнікоў. «Ты амаль не змянілася!», «Добра выглядаеш!», «Якія навіны?» — толькі і чуваць было ў рэдакцыйным калідоры. Каб павіншаваць газету, якой прысвяцілі не адзін дзясятак гадоў, ветэраны «Звязды» не пашкадавалі ні часу, ні сіл.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Прычым у прамым сэнсе слова! Вольга Лягчылава, якой у верасні споўніцца 96 (!) гадоў, у гэты дзень таксама была ў рэдакцыі газеты, што дала ёй пуцёўку ў жыццё. Вядома, да вайны (а Вольга Паўлаўна прыйшла на работу ў «Звязду» ў 1938 годзе) рэдакцыя знаходзілася ў іншым месцы, няма ўжо і яе калег, з якімі штодзённа сустракалася ў рэдакцыйных калідорах. Затое ёсць газета, людзі, якіх яна ведае калі не ў твар, дык па прозвішчах, публікацыях, якія штодзень чытае.

— Мяне ў «Звязду» прывёў брат, Аляксандр Русановіч, які працаваў тут літаратурным супрацоўнікам, — расказвае Вольга Паўлаўна. — Калі я прыйшла ў рэдакцыю, я ўпершыню ўбачыла дываны на лесвічных клетках. Па тым часе гэта была раскоша! Працавала ў аддзеле пісьмаў, рэдактарам якога была Ядвіга Савіцкая — у гады вайны яна разам з іншымі стварала падпольную газету. Шмат лістоў у той час у «Звязду» прыходзіла. Найбольш крытычныя разбіраліся на ўсіх узроўнях. Газету паважалі...

Надзея Нікалаенка працавала ў «Звяздзе» перакладчыцай. Кажа, што гэта цяпер усе пішуць па-беларуску. Некалькі дзесяцігоддзяў таму беларускамоўныя журналісты былі на вагу золата. Часам, як успамінае Надзея Гаўрылаўна, у дзень даводзілася перакладаць па 50 старонак тэксту.

Нягледзячы на адзін запіс у працоўнай кніжцы, Ларыса Ракітніцкая ў «Звяздзе» змяніла тры прафесіі. Была і падчытчыцай (чытала ўслых, а стыль-рэдактар правяраў памылкі), і карэктарам, і нават бібліятэкарам. Аказваецца, у «звяздоўскай» бібліятэцы захоўвалася нямала рэдкіх кніг. Журналісты былі частымі яе наведвальнікамі. Прычым іх цікавіла не толькі прафесійная літаратура, карысталіся попытам і мастацкія творы.

Прысутнічала на сустрэчы ветэранаў і былы карэктар Валянціна Шпілеўская. Дарэчы, менавіта яна ў свой час прыдумала рубрыку «Крынічка». Леанід Лахманенка шмат гадоў асвятляў на старонках «Звязды» міжнароднае жыццё. Цяпер свой бясцэнны вопыт ён перадае маладому пакаленню ў Інстытуце журналістыкі. А Яўген Жукоўскі, хоць радкоў не пісаў, пра газету ведаў нямала — на працягу доўгіх гадоў ён з'яўляўся рэдакцыйным вадзіцелем.

— Самы складаны перыяд быў, калі пераходзілі на камп'ютары, — успамінае Валянціна Дайнэка, якая не адно дзесяцігоддзе вярстала нашу газету. — Палова газеты — на метале, палова — на камп'ютары. Да апошніх баяліся дакрануцца! Потым навучыліся.

Сваё жыццё «Звяздзе» аддала і Валянціна Мазжарава, якая толькі нядаўна выйшла з рэдакцыйных сцен на заслужаны адпачынак. Карэктар са стажам у 48 (!) гадоў, яна памятае не адну байку, звязаную з памылкамі. «Як казаў наш супрацоўнік, партызан Янка Казлоў, памылка — тая ж партызанка: як трэба, знойдзе выхад».

Яны ўзгадвалі, як у розныя часы стваралі газету, часам жартавалі, размаўлялі пра тое, чым жыве сучаснае выданне. Здавалася, што час не ўладны над імі. Яны па-ранейшаму ў страі. І няважна, што не ствараюць газету непасрэдна ў рэдакцыйным цэху. Яны жывуць яе праблемамі і ўжо як нашы самыя адданыя чытачы ўдзельнічаюць у яе лёсе.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

Падручнік — не навуковы трактат

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Больш практыка-арыентаваных заданняў утрымліваецца і ў навучальным дапаможніку па беларускай літаратуры для 9-га класа. Напрыклад, заданні, якія даюць магчымасць вучню праявіць свае здольнасці ў літаратурнай творчасці: напісаць невялікі верш па зададзеных рыфмах або невялікую замалёўку па творы, што вывучаецца ў класе.

Высокая ацэнка

Цяпер вядзецца работа над электроннай праграмай да падручніка па інфарматыцы для сямікласнікаў, якая будзе валодаць большымі інтэрактыўнымі магчымасцямі, чым проста PDF-версія падручніка. Увогуле магчымасці інфармацыйных тэхналогій актыўна выкарыстоўваюцца пры стварэнні новых падручнікаў. Ужо створаны электронны падручнік-навігатар па хіміі, распрацаваны электронныя праграмы да навучальных дапаможнікаў па прадмеце «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)», падручніках па замежных мовах. Разам з тым навучэнцы і педагогі могуць выкарыстоўваць і PDF-версіі падручнікаў, якія размешчаны ў свабодным доступе на Нацыянальным адукацыйным партале. У PDF-версіях новых падручнікаў ёсць гіперспасылкі, якія дазваляюць пераходзіць на іншыя адукацыйныя рэсурсы, размешчаныя на партале...

Як расказала Валянціна Гінчук, работа над новымі навучальнымі дапаможнікамі пачалася яшчэ ў 2015 годзе. Першая група, якая складаецца з васьмі падручнікаў, ужо прайшла апрабацыю — яны выкарыстоўваліся ў адукацыйным працэсе ў 2016/2017 навучальным годзе. Па выніках апрабацыі ў канцы мая гэтага года было праведзена

Фота Надзеі БУЖАН.

анкетаванне педагогаў, якое ахапіла больш за 5 тысяч настаўнікаў з усіх рэгіёнаў краіны.

— Большасць педагогаў ацанілі новыя навучальныя дапаможнікі на «добра» і «выдатна», — адзначыла намеснік дырэктара інстытута. — Акрамя таго, педагогам задаваліся і адкрытыя пытанні. Кожны з іх меў магчымасць унесці сваю прапанову па змяненні ці паляпшэнні дапаможніка.

Акцэнт — на даступнасць

З 2015 года вялася таксама работа і над новымі навучальнымі праграмамі па ўсіх школьных прадметах, якія паэтапна ўкараняліся ў адукацыйны працэс.

Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірыны КАРЖОВАЙ**, сёлета былі створаны рабочыя групы, у склад якіх увайшлі выкладчыкі ўстаноў вышэйшай адукацыі, навукоўцы, настаўнікі-практыкі, якія яшчэ раз прааналізавалі ўсе праграмы па ўсіх прадметах. Па выніках аналізу правялі іх карэкціроўку. У першую чаргу, спецыялісты ўлічылі міжпрадметныя сувязі. Некаторыя тэмы былі перанесены з аднаго класа ў іншы з улікам узроставых асаблівасцяў вучняў і магчымасцяў успрымання матэрыялу. Навучальныя праграмы таксама праглядаліся з улікам адноснай завершанасці другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі (маецца на ўвазе базавая школа), паўнаты і паслядоўнасці выкладання матэрыялу. У сваю чаргу, навучальныя праграмы для базавага і павышанага ўзроўню на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі (у 10—11-х класах) былі дапрацаваны з улікам вывучэння таго ці іншага матэрыялу на базавым і павышаным узроўнях.

— Новыя навучальныя праграмы дазволяць знізіць нагрузку на школьнікаў, — запэўнівае **намеснік дырэктара Нацыянальнага інстытута адукацыі па навукова-даследчай рабоце Вольга ЗЕЛЯНКО.** — У іх прапісаны канкрэтныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці па кожным раздзеле праграмы, каб педагог кантраляваў веды і ўменні навучэнцаў па зададзеных крытэрыях і паказчыках. Па-другое, вывучэнне асобных складаных для ўспрымання тэм перанесена ў старшыя класы альбо з базавага на павышаны ўзровень навучання. Напрыклад, у курсе біялогіі цяпер толькі на павышаным узроўні будуць вывучацца такія раздзелы, як «Паводзіны як вынік эвалюцыі» і «Структурная арганізацыя і рэгуляцыя функцый жывых арганізмаў».

У курсе матэматыкі толькі на павышаным узроўні будзе вывучацца тэма «Вытворная». Пазбегнуць перагрузкі школьнікаў дапаможа таксама скарачэнне залішняй тэрміналогіі па асобных вучэбных прадметах.

Напрыклад, на ўроках беларускай мовы раней вывучаліся віды аднасастаўных сказаў і праводзіўся кантроль па гэтай тэме. Цяпер ад навучэнцаў патрабуецца мець толькі агульнае ўяўленне аб аднасастаўных сказах і ўменне адрозніваць іх ад двухсастаўных, але яны не абавязаны адрозніваць пэўна-асабовыя ад няпэўна-асабовых сказаў, таму што гэтыя веды не маюць ярка выражанай практычнай накіраванасці. Акрамя таго, асобныя тэмы перавезены з тэарэтычнага на практычны ўзровень засваення. Гэта значыць, што навучэнец не абавязаны будзе завучваць фармулёўкі правілаў па пэўных тэмах: ён будзе вывучаць матэрыял на канкрэтных прыкладах. У прыватнасці, у курсе беларускай мовы на ўзроўні практычнага прымянення выкладаецца тэма «Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці слоў розных часцін мовы». З гэтай тэмай вучняў будуць знаёміць пры рабоце з тэкстамі розных стыляў, тыпаў і жанраў. Таксама праведзена работа па ўзгадненні зместу асобных вучэбных прадметаў, каб выключыць дубліраванне блізкіх тэм у рамках прадметаў у адной адукацыйнай вобласці. Праграмы па фізіцы і хіміі цяпер добра карэлююць з праграмай па матэматыцы і наадварот.

На сумленні педагогаў

Ці засталіся яшчэ рэзервы для спрашчэння навучальных праграм? Ірына Каржова лічыць, што нельга рабіць гэта бясконца, таму што ёсць рызыка страціць тую якасць адукацыі, якой мы ганарымся. Наколькі істотна зменіцца адукацыйны кантэнт у наступным навучальным годзе можна даведацца, зайшоўшы на Нацыянальны адукацыйны партал, дзе размешчаны ўсе зацверджаныя да новага навучальнага года праграмы па ўсіх прадметах.

Да таго ж спрашчэнне навучальных праграм — не адзіны механізм зніжэння вучэбнай нагрузкі на школьнікаў. Не менш важнай умовай з'яўляецца нарміраванне дамашніх заданняў.

— Асноўны вучэбны матэрыял павінен засвойвацца на ўроку, — упэўнена Валянціна Гінчук. — Мэта дамашніх заданняў — паўтарыць і замацаваць, а новы матэрыял, які не быў засвоены на ўроку, не можа задавацца ў якасці дамашняга задання. Існуе строга нармаваны дакументам Міністэрства аховы здароўя час на падрыхтоўку дамашніх заданняў. Кожны настаўнік, напэўна, лічыць, што яго прадмет самы галоўны, але пры вызначэнні аб'ёму дамашняга задання важна ўлічваць, што, акрамя фізікі, вучань, напрыклад, будзе выконваць заданні па гісторыі, рускай мове, літаратуры...

Да новага навучальнага года на Нацыянальным адукацыйным партале будзе размешчана каляндарна-тэматычнае планаванне па ўсіх прадметах для ўсіх класаў. У ім вызначаны аб'ёмы дамашняга задання да кожнага ўрока. Для настаўніка — гэта арыенцір. Галоўнае, каб педагог на яго не заплюшчваў вочы...

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

ЗАВЕРЕНО
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
04.08.2017 г.
Сушко С.А.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об эмиссии облигаций второго выпуска Общества с ограниченной ответственностью «Торговый дом «Немига-Фаворит»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

на белорусском языке: полное: Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Гандлёвы Дом «Нямiга-Фаварыт»; сокращенное: ТАА «ГД «Нямiга-Фаварыт»;

на русском языке: полное: Общество с ограниченной ответственностью «Торговый дом «Немига-Фаворит» (далее – эмитент);

сокращенное: ООО «ТД «Немига-Фаворит».

2. Юридический адрес: Республика Беларусь, 220038, г. Минск, 2-ой пер. Багратиона, д. 18а, каб. 6; почтовый адрес: Республика Беларусь, 220088, г. Минск, Смоленская, 25, оф. 501.

3. Общество с ограниченной ответственностью «Торговый Дом «Немига-Фаворит», г. Гродно, зарегистрировано решением Гродненского городского исполнительного комитета от 29 июня 2001 г. № 541 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (далее – ЕГР) за номером 500344877, в связи с изменением наименования и местонахождения которого решением Минского городского исполнительного комитета от 1 марта 2016 г. зарегистрирован эмитент в ЕГР за номером 500344877.

4. Уставный фонд Эмитента составляет 1180 белорусских рублей.

5. Основной вид деятельности эмитента – сдача внаем собственного и арендуемого недвижимого имущества.

6. Депозитарием эмитента является депозитарий Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – ОАО «АСБ Беларусбанк») (банк зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 1995 года, номер государственной регистрации – 056, код депозитария – 005), расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, код 153001795, действующий на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1089, срок действия не ограничен.

7. Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает информацию на рынке ценных бумаг путем: размещения на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг; публикации в печатных средствах массовой информации (в газете «Звязда») и (или) размещения на официальном интернет-сайте эмитента, указанном в пункте 2 настоящего документа; и (или) доводит до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг (далее – регистрирующий орган).

Информация об изменениях и/или дополнениях, внесенных в Проспект эмиссии облигаций второго выпуска эмитента (далее – Проспект эмиссии), размещается эмитентом на едином информационном ресурсе, а также публикуется в газете «Звязда» не позднее 7 дней после их регистрации в регистрирующем органе.

Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает годовой отчет в срок не позднее одного месяца после его утверждения в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь о хозяйственных обществах, путем размещения на едином информационном ресурсе, а также путем опубликования в газете «Звязда».

Эмитент раскрывает информацию о своей реорганизации или ликвидации, а также о реорганизации дочерних и зависимых хозяйственных обществ эмитента (при их наличии), в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе путем ее размещения на едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней:

в случае ликвидации – с даты принятия соответствующего решения единственного участника эмитента;

в случае реорганизации – с даты принятия соответствующего решения единственного участника эмитента, а также с даты государственной регистрации организации, созданной в результате реорганизации; с даты внесения в единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей записи о прекращении деятельности присоединенной организации.

Кроме того, в случае принятия эмитентом решения о ликвидации (прекращении деятельности) сведения о том, что эмитент находится в процессе ликвидации (прекращения деятельности), подлежат размещению в глобальной компьютерной сети Интернет на официальном сайте юридического научно-практического журнала «Юстиция Беларуси» (www.justbel.info) в порядке и сроки, определенные законодательством Республики Беларусь.

Эмитент раскрывает информацию о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем:

ее размещения на едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней с даты получения эмитентом копии заявления в экономический суд о банкротстве эмитента;

публикации в журнале «Судебный вестник Плюс: Экономическое правосудие» в течение 5 календарных дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Эмитент раскрывает информацию о результатах финансово-хозяйственной деятельности, информацию о существенных фактах (событиях, действиях), касающихся его финансово-хозяйственной деятельности, которые могут повлиять на стоимость облигаций настоящего выпуска, в порядке и сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.

В период всего срока обращения облигаций настоящего выпуска эмитент несет ответственность по возмещению их владельцам убытков, причиненных недостоверной и (или) неполной информацией об облигациях настоящего выпуска.

8. Настоящий выпуск облигаций зарегистрирован регистрирующим органом 4 августа 2017 г.

Государственный регистрационный номер: 5-200-02-3066.

9. Облигации второго выпуска эмитента – именные процентные конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равную номинальную стоимость и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска вне зависимости от времени приобретения облигации (далее совокупно именуемые – облигации).

Объем выпуска облигаций – 2 250 000 (Два миллиона двести пятьдесят тысяч) долларов США.

Количество облигаций – 4500 штук.

Номинальная стоимость облигации – 500 (Пятьсот) долларов США.

10. Эмитент осуществляет эмиссию необеспеченных облигаций без учета положений, предусмотренных в подпункте 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг», в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 названного Указа.

11. Размещение облигаций осуществляется:

после опубликования в газете «Звязда» и размещения на едином информационном ресурсе настоящего документа, заверенного в установленном порядке регистрирующим органом;

путем проведения открытой продажи Облигаций юридическим лицам (включая банки) и (или) физическим лицам, резидентам и (или) нерезидентам Республики Беларусь (далее – покупатели облигаций).

Дата начала размещения облигаций: 10 августа 2017 г.

Дата окончания размещения облигаций: 10 августа 2026 г.

Открытая продажа облигаций приостанавливается в период с даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты дохода до даты выплаты дохода (указаны в Проспекте эмиссии). В дату выплаты дохода открытая продажа возобновляется.

Открытая продажа Облигаций осуществляется на организованном рынке в торговой системе открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – организатор торговли) в соответствии с законодательством Республики Беларусь и локальными нормативными правовыми актами Организатора торговли.

Время проведения открытой продажи облигаций – в соответствии с регламентом торгов организатора торговли.

Для покупки Облигаций покупатели могут обратиться в ОАО «АСБ Беларусбанк» (далее – уполномоченный брокер) в его точки обслуживания. Перечень точек обслуживания и их режим работы размещен на официальном интернет-сайте уполномоченного брокера (http://belarusbank.by), а также на официальном интернет-сайте эмитента: www.n-favorit.by.

Денежные средства в долларах США, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, будут зачисляться в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на текущий (расчетный) счет эмитента BY52PJCB30126015351010000840 в «Приорбанк» ОАО (ЦБУ 101 в г. Минске, код PJCBBY2X, г. Минск, ул. Тимирязева, 65А).

12. Срок обращения облигаций – 3652 календарных дня (с 10 августа 2017 г. по 10 августа 2027 г.)

13. Дата начала погашения облигаций – 10 августа 2027 г.

14. По облигациям установлен постоянный процентный доход (далее – доход), выплачиваемый периодически в течение срока обращения облигаций по ставке 7,75 (Семь целых семьдесят пять сотых) процента годовых.

Платежным агентом по выплате дохода по облигациям, по досрочному погашению и погашению облигаций является депозитарий эмитента (далее – платежный агент).

Выплата дохода владельцам облигаций производится: ежеквартально в даты выплаты дохода; на основании реестра владельцев облигаций для целей выплаты дохода; путем перечисления платежным агентом в безналичном порядке суммы дохода в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь. В случае выплаты дохода в белорусских рублях выплата осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату выплаты дохода.

15. Эмитент осуществляет досрочное погашение облигаций (части облигаций), находящихся в обращении, по решению единственного участника эмитента в случае, установленном законодательством Республики Беларусь, при невозможности предоставления обеспечения.

Кроме того, эмитент вправе по собственной инициативе принять решение о досрочном погашении облигаций (части облигаций), находящихся в обращении.

Досрочное погашение облигаций осуществляется по текущей стоимости облигации, рассчитанной на дату досрочного погашения. В случае если дата досрочного погашения совпадает с датой выплаты дохода, досрочное погашение осуществляется по номинальной стоимости облигации.

Платежный агент перечисляет в безналичном порядке причитающуюся сумму в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь на счета владельцев Облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае досрочного погашения Облигаций в белорусских рублях досрочное погашение осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату досрочного погашения Облигаций. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации с учетом правил математического округления, с точностью до целой белорусской копейки.

16. При погашении облигаций владельцам облигаций выплачивается номинальная стоимость облигаций, а также доход за последний период начисления дохода (иной неполученный доход – при наличии).

Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента на 6 августа 2027 г. Платежный агент перечисляет в безналичном порядке причитающуюся сумму в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь на счета владельцев облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае погашения в белорусских рублях погашение осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату начала погашения облигаций. Округление полученных значений осуществляется по каждой облигации с учетом правил математического округления с точностью до целой белорусской копейки.

17. В период обращения облигаций эмитент осуществляет приобретение облигаций до даты начала погашения облигаций с возможностью последующего обращения облигаций (далее – досрочный выкуп облигаций) на организованном рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь и правилами, определяемыми организатором торговли.

Эмитент обязуется осуществлять досрочный выкуп облигаций по текущей стоимости облигаций в следующие даты: 08.08.2018, 08.08.2019, 07.08.2020, 08.08.2021, 08.08.2022, 08.08.2023, 06.08.2024, 08.08.2025, 08.08.2026, 03.08.2027. Владельцы облигаций вправе требовать досрочного выкупа облигаций только в указанные даты при соблюдении процедуры, определенной Проспектом эмиссии. В иные даты досрочный выкуп облигаций эмитентом не осуществляется.

18. В случае запрещения эмиссии облигаций, признания регистрирующим органом настоящего выпуска облигаций недействительным, эмитент возвращает владельцам облигаций средства, полученные в оплату размещенных облигаций, а также накопленный по этим облигациям доход в месячный срок с даты признания выпуска недействительным и письменно уведомляет регистрирующий орган о возврате указанных средств владельцам облигаций в полном объеме.

19. Ознакомиться с копией зарегистрированного Проспекта эмиссии (зарегистрированными изменениями в Проспект эмиссии – при наличии) можно в точках обслуживания уполномоченного брокера. Перечень точек обслуживания и их режим работы размещен на официальном интернет-сайте уполномоченного брокера (http://belarusbank.by), а также на официальном интернет-сайте эмитента (www.n-favorit.by).

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 жніўня 2017 г. №29 (413)

стар. 3

У палявых умовах

стар. 6

Унікальны эксперымент у Чавусах

стар. 8

Поўны набор вольнасцяў!

ТЭМА ТЫДНЯ

ВЫВЕСЦІ НА ЧЫСТУЮ ВАДУ

Якія таямніцы і праблемы хаваюцца ў звычайнай пітной вадзе?

Фота БЕЛТА.

Ачышчальныя збудаванні — важны аб'ект для «воднай» сістэмы краіны. Ад іх якаснай работы залежыць, ці пацерпіць наваколле ў выніку выкарыстання чалавекам прыродных багацця ў.

Кожную раніцу мы пачынаем з вады: умываемся, п'ём гарбату ці каву, паліваем кветкі... Гэтае рэчыва акружае нас паўсюль. І таму часам мы не звяртаем увагі на тое, якія перашкоды пераадольвае вада, каб трапіць да нас чыстай і бяспечнай, не беражом яе і нават забруджваем...

Можна піць з-пад крана

— Якасная пітная вада не павінна змяшчаць мікраарганізмы, хімічныя злучэнні і радыеактыўныя рэчывы ў колькасцях, якія перавышаюць гігіенічныя нарматывы, а таксама не павінна мець пабочных пахаў і прысмакаў, — расказала **загадчыца аддзялення камунальнай гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ЖАЎНЯК.**

стар. 4–5

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

ШКОЛУ ЗАКРЫЛІ. ШТО ЎЗАМЕН?

Стагадовы будынак зменіць статус

У новым навучальным годзе базавая школа №14 у Гродне ўжо не будзе прымаць вучняў. Усе 50 школьнікаў размеркаваны па некалькіх школах абласнога цэнтра. Драўляны будынак былой навучальнай установы не будзе пуставаць — яго зоймуць пенсіянеры. Тут плануюць уладкаваць аддзяленне для арганізацыі вольнага часу пажылых гродзенцаў.

Раней школа знаходзілася ў вёсцы Грандзічы. Зараз гэту тэрыторыю далучылі да горада і замест вёскі з'явіўся мікрараён. А базавая школа набыла статус гарадской навучальнай установы.

Вось ужо роўна 50 гадоў, як яна знаходзіцца ў былым панскім маёнтку. Аднапавярховы будынак быў драўляным, але праз некаторы час яго абклалі белай цэглай. Пакуль школа яшчэ на балансе аддзела адукацыі, але да 1 верасня будынак павінен быць перададзены сацыяльнаму цэнтру Ленінскага раёна Гродна.

Першае ўражанне атрымліваем не столькі ад самой школы, колькі ад школьнага двара. Стройныя туі ўзвышаюцца каля сцен будынка, а ўся тэрыторыя зіхаціць ад яркага колеру кветак і розных раслін. Па ўсім відаць, сюды ўкладзена нямала працы і зроблена гэта з душой.

Пакуль навучальная ўстанова яшчэ працуе, хоць класы і расфарміраваны. Усе вучні ўладкаваны па некалькіх школах Гродна, паведаміла **дырэктар Таццяна ГАЛАВЕНКА.** Яна праводзіць мяне па школе, якой кіравала 17 гадоў. Некалькі памяшканняў, дзе ішлі заняткі, зусім пустыя, але даволі акуратныя — сцены пафарбаваныя, на падлозе — ламінат. У холе стаіць піяніна. Гэта адзін з нямногіх прадметаў, якія тут застануцца. Практычна ўсё ўжо вывезена. Напрыклад, свой музейны пакой школьнікі перадалі мясцоваму праваслаўнаму храму. Экспазіцыя расказвае аб лёсе жыхароў былой вёскі ў гады вайны.

Таццяна Аляксандраўна паведаміла, што размова аб закрыцці школы вялася ўжо гадоў пяць. Колькасць дзяцей змяншаецца, і ўтрыманне ўстановы становіцца вельмі

затратным. Адзінае, што стрымлівала закрыццё, — гэта навучанне па інтэграванай сістэме. У школе займалася 70% дзяцей з асаблівасцямі развіцця, і тут дабіліся значных поспехаў у інклюзіўнай адукацыі. Вопыт ездзілі пераймаць у Расію і Польшчу.

Зараз колькасць класаў з інтэграваным падыходам павялічылася. У Гродне такіх навучальных устаноў некалькі, і яны здольны прыняць грандзіцкіх школьнікаў.

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ ПЫТАННІ — НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ

Менавіта яны разглядаліся на сесіі Чачэрскага раённага Савета дэпутатаў

Удзел у пасяджэнні прыняла член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Звязда» Галіна ТРЫБУНАХ.

На сесіі быў зацверджаны план мерапрыемстваў па ажыццяўленні ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі сельскагаспадарчых жывёл і статкаў, прадуктаў жывёльнага паходжання. Асобна закраналіся пытанні забеспячэння нагляду за сельскагаспадарчымі жывёламі і прадуктамі такога паходжання. Акрамя таго, у рабоце 32-й сесіі Чачэрскага раённага Савета дэпутатаў 27-га склікання была разгледжана магчымасць прадастаўлення паверхневага воднага аб'екта ў арэнду для рыбаводства, што не раз выклікала пытанні ў насельніцтва. У ходзе абмеркавання пытанняў Галіна Трыбунах асаблівую ўвагу звярнула на выкананне заканадаўства па ахове навакольнага асяроддзя.

ПОЗІРК НА ЎСХОД

Японскія вучні наведалі Савет Рэспублікі

На мінулым тыдні ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ правёў сустрэчу са старшынёй японскай некамерцыйнай арганізацыі «Happy Road Net» Ю. Нісімота і японскімі школьнікамі.

Парламентарый азнаёміў членаў дэлегацыі з дзейнасцю Савета Рэспублікі, а таксама расказаў пра тое, як у міжсесійны перыяд вядзецца работа над законапраектамі. Асобна Сяргей Рахманаў спыніўся на парадку разгляду праектаў законаў на сесіях Савета Рэспублікі. Акрамя дзейнасці верхняй палаты беларускага парламента, удзельнікі закранулі тэму беларуска-японскага супрацоўніцтва, а менавіта — магчымасці пашырэння ўзаемаадносін у гуманітарнай, турыстычнай і адукацыйнай сферах.

Арганізацыя «Happy Road Net» размяшчаецца ў рэгіёне Хамадоры ва ўсходняй частцы прэфектуры Фукусіма. Сумесна з вучнямі сярэдняй і старшай школы арганізацыя займаецца валанцёрскай дзейнасцю для развіцця свайго раёна.

У КАНТАКЦЕ З АБЛАСЦЯМІ І РАЁНАМІ

Працягваецца падрыхтоўка да пятага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі

У Магілёве адбылася нарада з членамі рабочай групы Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта па пытаннях падрыхтоўкі пятага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбудзецца ў Магілёўскай вобласці ў 2018 годзе. Сустрэча прайшла пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіміра ПАНЦЮХОВА.

Акрамя таго, парламентарый наведаў адкрытае акцыянернае таварыства «Казіміраўскі доследна-эксперыментальны завод», на якім яго азнаёмілі з цяперашнім станам у сферы рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі. Наведваючы адкрытае акцыянернае таварыства «Агракамбінат «Усход», Уладзімір Панцюхоў пракантраляваў ход уборачнай кампаніі.

На другі дзень старшыня Пастаяннай камісіі прыняў удзел у пасяджэнні прэзідыума Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў. Цэнтральным пытаннем стаў бюджэт рэгіёна на 2018 год, а таксама стан спраў у галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі вобласці.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ. *lukashevich@zviazda.by*

ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА

АДЗІНЫЯ МЭТЫ ДЛЯ ЎСЯГО СВЕТУ

Да канца 2018-га Белстат плануе стварыць нацыянальную платформу для прадстаўлення справаздачнасці па Мэтах устойлівага развіцця (МУР). Галоўны прынцып, які датычыцца Мэт, — «ніхто не павінен застацца ўбаку», таму ўжо сёння на сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта ўсе зацікаўленыя могуць паўдзельнічаць у абмеркаванні напрамкаў устойлівага развіцця.

Наша краіна актыўна ідзе да дасягнення 17 мэт. Сёлета быў створаны Савет па ўстойлівым развіцці пад кіраўніцтвам **нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намесніка старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яны ШЧОТКІНАЙ**. У яго ўвайшлі 38 прадстаўнікоў выканаўчай улады (усе зацікаўленыя міністэрствы). За кожным замацаваны паказчыкі (усяго іх каля 200), над якімі яны працуюць. Мар'яна Шчоткіна адзначыла, што да працы будуць прыцягнуты міжнародныя і грамадскія арганізацыі, а таксама парламентарыі, таму што ўсе заканадаўчыя акты павінны прымацца з улікам МУР. На 2018-ы запланавана правесці парламенцкія слуханні, каб абмеркаваць дзейнасць па дасягненні пастаўленых мэт.

Тры асноўныя напрамкі, раскрытыя ў 17 мэтах, — гэта эканоміка, экалогія і сацыяльныя праблемы. Так, толькі 20% дзяцей у свеце маюць магчымасць атрымаць бясплатную адукацыю, а 767 мільёнаў жывуць у галечы. Рост беспрацоўя, недахоп пітной вады, пагроза тэрарыстычных атак — гэта праблемы, з якімі сутыкаюцца многія краіны, пераадолець іх у адзіночку амаль немагчыма, таму на першы план выходзяць салідарнасць і інтэграцыя.

Як адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення шматбаковай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў Беларусі Ларыса БЕЛЬСКАЯ**, наша краіна па дасягненні Мэт устойлівага развіцця актыўна працуе з міжнароднымі партнёрамі, найбліжэйшыя з якіх — краіны ЕАЭС. Сёлета ўпершыню быў прадстаўлены даклад, падрыхтаваны Еўразійскай эканамічнай камісіяй, аб руху краін-удзельніц да Мэт. Вопыт Беларусі запатрабаваны сярод замежных партнёраў, якія зацікаўлены ў сумесных дзеяннях.

Мар'яна Шчоткіна нагадала пра шэраг мер, прынятых у краіне, якія суадносяцца з Мэтамі ўстойлівага развіцця. Ажыццяўляецца паслядоўная дзяржаўная палітыка па падтрымцы малазабяспечаных. У 2016 годзе 5,7% насельніцтва афіцыйна адносілася да гэтай катэгорыі. Гэты паказчык удвая ніжэйшы за сярэдні па краінах СНД і Усходняй Еўропы. Да 2030-га плануецца яго паменшыць да 4%. Увага аддаецца якасці жыцця ў пажылым узросце. У Беларусі 2,6 млн пенсіянераў і падтрымліваецца паказчык узроўню пенсій па ўзросце не ніжэй за 40% ад сярэдняй заработнай платы па краіне. Дасягнуты ўзровень уласнай вытворчасці дазваляе гарантаваць даступнасць і якасць харчавання для насельніцтва. Летась у глабальным рэйтынгу харчовай бяспекі Беларусь заняла 46-е месца з 113 дзяржаў. Наша краіна займае 52-е месца па індэксе чалавечага развіцця і да 2030-га плануе ўвайсці ў спіс 40 краін.

Прадстаўнік ПРААН у Беларусі Санака САМАРАСІНХА расказаў, што сёлета адзначаецца 25-годдзе прысутнасці ААН у Беларусі. За гэты час шмат працы было зроблена ў плане аказання падтрымкі людзям, якія пакутуюць ад наступстваў ЧАЭС, дзецям, бедным слаям насельніцтва, мігрантам, людзям з ВІЧ... Беларусь зрабіла вялікі крок у развіцці, у тым ліку дасягнуўшы датэрмінова большасці Мэт развіцця тысячагоддзя.

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

Збіраем па тысячы

У пачатку жніўня ў шэрагу рэгіёнаў пачалі ўжо віншаваць экіпажы-тысячнікі.

Першым у Баранавіцкім раёне стаў маладзёжны экіпаж у складзе старшага камбайнера Максіма Казімірчыка і яго памочніка Віктара Кіслага з філіяла «Прыазёрны» птушкафабрыкі «Дружба», пра што паведамляе газета «Наш край». Павіншаваць лідараў на хлебнай ніве прыехалі намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Калінін, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Васіль Маркевіч, старшыня Баранавіцкага райвыканкама Васіль Хвацік.

Маладым маці на заметку

Жанчыны ў дэкрэтным адпачынку па накіраванні службы занятасці могуць прайсці бясплатнае прафесійнае навучанне або павысіць кваліфікацыю, пра што нагадвае «Воранаўская газета».

Намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага гарвыканкама Аксана Флярко тлумачыць, што раней з выкарыстаннем сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва прайсці прафесійнае навучанне маглі толькі афіцыйна беспрацоўныя грамадзяне, якімі маці ў перыяд догляду дзіцяці да трох гадоў не з'яўляюцца. «Прынятая мера значна павышае шанцы жанчыны пасля выхаду з дэкрэта хутка знайсці працу ў адпаведнасці з атрыманай прафесіяй», — адзначыла Аксана Флярко. У Гродне жанчынам прапаноўваюць вучыцца ў сярэднім пяць месяцаў на кандытара, кухара, прадаўца, швачку, цырульніка ці бухгалтара. На перыяд вучобы выплачваецца стыпендыя.

Айда вянчацца!

У Жыткавіцкім раёне ўсе ахвотныя пары могуць паўдзельнічаць у масавым вянчанні. Плануецца, што яно пройдзе 17 верасня ў Тураўскім кафедральным саборы.

Фота БЕЛТА.

Летась масавае вянчанне прайшло 8 ліпеня, у Дзень памяці святых Пятра і Фяўроніі, апекуноў сям'і і шлюбу. Але сёлета гэты дзень выпаў на Пятроў пост, таму масавы абрад вырашылі перанесці. Новую дату выбіралі не выпадкова: у верасні мошчы святых былі перанесены ў Свята-Троіцкі жаночы манастыр Мурама. Усе ахвотныя павянчацца могуць звярнуцца ў кафедральны сабор і прайсці падрыхтоўку да таінства.

Калі агурок усяму галава

Свята агурка — традыцыйнае ў Шклоўскім раёне — пройдзе 12 жніўня. Адзінаццаты раз Шклоў збярэ гасцей.

У праграме выстаўка-дэгустацыя саленняў, кансерваванай агародніны і садавіны, а таксама хлебабулачных вырабаў. У суботу а 10 гадзіне побач са скульптурнай кампазіцыяй «Шклоўскі Агурок» пачнецца тэатралізаваны спектакль. Свята працягнецца ў гарадскім парку. Госці змогуць паўдзельнічаць у конкурсах і майстар-класах, а таксама спартыўных спаборніцтвах. Шмат цікавінак запланавана для дзяцей: выступленне тэатра мініяцюр, атракцыёны, пракат гіраскутараў і іншае. У парку будуць працаваць ажно тры канцэртныя пляцоўкі: эстрадная, народная і дзіцячая.

Два колы небяспекі

Сёлета ў Гарадоцкім раёне затрыманы пяць кіроўцаў, якія былі за рулём мотатранспарту ў стане алкагольнага ап'янення, дзесяць — без права кіравання, чатыры адзінкі мотатранспарту не былі зарэгістраваны ў ДАІ.

Усяго з пачатку года да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 52 кіроўцы мотатранспартных сродкаў. Каб змяніць сітуацыю, паведамляе «Гарадоцкі Веснік», у раёне пачалася акцыя «Калёс менш — небяспекі больш!» Яна нагадвае пра пэўныя рызыкі для кіроўцаў двухколавых транспартных сродкаў і заклікае прытрымлівацца правілаў дарожнага руху.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

У ПАЛЯВЫХ УМОВАХ

ІНСТРУКТАЖ, ЯКІ ВЫРАТУЕ ЖЫЦЦЁ

Бочка з помпай, трактар з плугам, пажаратушыльнік і іскрагасільнік... Што яшчэ патрэбна, каб ва ўмовах спякотнай уборачнай адчуваць сябе бяспечна за рулём камбайна?

У Гомельскім раёне на палетках, што належаць ААТ «Рассвет», камбайны ідуць шарэнгай — быццам для прыгожага фотаздымка. Прыпыняюцца, толькі калі лямпачка на кабіне пачынае сігналіць пра поўны бункер. Гэтым момантам карыстаюцца не толькі кіроўцы машын, якія прымаюць і адвозяць сабранае зерне, але і спецыялісты пажарнай аховы і міліцыі.

Камбайнер Віталь Андрусеў і яго памочнік Юрый Жура дастаюць дакументы, якія сведчаць, што механізатары маюць поўнае права кіраваць вялізнай збожжаўборачнай машынай. Афіцэр дарожна-патрульнай службы аддзела ДАІ Гомельскага райвыканкама Ягор Кананенка ўважліва разглядае не толькі паперы, але саміх мужчын і камбайн, на якім яны працуюць:

— Правяраем у першую чаргу фізічны стан кіроўцаў. Наяўнасць пасведчанняў кіроўцы адпаведнай катэгорыі. Глядзім, каб тэхагляд на транспартны сродак быў пройдзены. Таксама звяртаем увагу на спраўнасць машыны ўвогуле, у тым ліку светлавых прыбораў і гукавой сігналізацыі.

Клопат старшага інспектара Гомельскага раённага падраздзялення МНС Ігара Паўлянкова — праверка наяўнасці першасных сродкаў пажаратушэння побач з кабінай і іскрагасільнікаў на выхлапных трубах. Вогнетушыцелі — не пратэрмінаваныя і на месцы, скрыня з пяском і рыдлёўкі — таксама. Слядоў падцякання паліва і масла няма.

Галоўны інжынер ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Сяргей Парукаў хвалюецца за падначаленых, якім пастаянна з самага ранку перад выхадам на поле яшчэ і яшчэ раз нагадваюць пра бяспеку:

— Да пачатку ўборачнай кампаніі нашай гаспадаркай была праведзена комплексная падрыхтоўка ўборачнай тэхнікі. У тым ліку ўкамплектавалі яе супрацьпажарнымі сродкамі. З людзьмі правялі пажарна-тэхнічны інструктаж. Рабочаму персаналу выдалі спецадзенне. Пры рабоце ў палявых умовах заўсёды забяспечваецца наяўнасць супрацьпажарнага транспарту і спецыяльная тэхніка для тушэння пажараў. Да таго ж ратавальнікі праводзяць перыядычныя праверкі ў палявых умовах і на сушыльных комплексах. Яны даюць рэкамендацыі супрацоўнікам гаспадаркі. Пры неабходнасці мы разам з імі прымаем аператыўныя рашэнні.

Галодны механізатар — дрэнны работнік. Каб перапынкі на абед ва ўмовах жніва зрабіць мінімальнымі, гарачую ежу

Старшы інспектар Гомельскага раённага падраздзялення МНС Ігар ПАЎЛЯНКОЎ правярае спраўнасць сродкаў пажаратушэння на камбайне, якім кіруе Віталь АНДРУСЕЎ.

дастаўляюць людзям у поле двойчы на дзень. Гэта даўно стала правілам, але ж сітуацыю працягваюць кантраляваць, у тым ліку і прафсаюзы.

Літаральна на нашых вачах на поле ААТ «Калінінскі», што ў Добрушскім раёне, механізатарам падвезлі гарачае харчаванне і бутэлькі з халоднай вадой. Яны скарысталіся перапынкам і сабраліся, каб не толькі перадыхнуць крыху ад спякотнай работы, але і паслухаць парады прадстаўнікоў МНС. Першы намеснік начальніка Добрушскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Андрэй Шаршнёў нагадвае механізатарам правілы бяспекі і дзеянні пры ўзнікненні ўзгарання.

Сямнаццаць гадоў узначальвае гаспадарку «Калінінскі» Віктар Байдаў. Ён кажа, уборка, якая сёлета пачалася са спазненнем на два тыдні, дала магчымасць праверыць усю тэхніку на 100%:

— Камбайны стаялі падрыхтаванымі і толькі чакалі выхаду ў поле. Вядома, напярэдадні праводзілі адпаведную работу з камбайнерамі па ахове працы і супрацьпажарных мерапрыемствах. Супрацоўнікі Добрушскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях правяраюць нашу тэхніку пастаянна. На полі заўсёды дзяжураць бочка з помпай і трактар з плугам. Апошні — гэта калі раптам, у выпадку ўзгарання, спатрэбіцца хутка абворваць зямлю. Людзі праінструктаваны. Яны разумеюць, што трэба своечасова, якасна і без страт убраць вырашчаны ўраджай.

Трактарыст Фёдар Грышчанка — сёння і ёсць той чалавек, які гатовы ў любы момант увагнаць плуг у глебу, каб не дапусціць распаўсюджвання агню. Сам ён доўгі час працаваў камбайнерам. Гаворыць, на яго памяці пажары на полі здараліся:

— У такой сітуацыі трэба дзейнічаць вельмі хутка і кампетэнтна. Тады паспееш выратаваць жыццё людзей, тэхніку і ўраджай.

Хоць апошнім часам не адбывалася надзвычайных сітуацый, механізатар разумее, што расслабляцца нельга. Таму на пытанні старшага інспектара нагляду і прафілактыкі Добрушскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Паўла Ліпава адказвае ўпэўнена.

Інструктаж па тэхніцы бяспекі на ўборачнай праходзіць на полі ААТ «Калінінскі».

— У гэты раз парушэнняў мы не знайшлі, — падводзіць вынікі рэйду афіцыйны прадстаўнік Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марыя Клязовіч. — На шчасце, па ўсёй Гомельскай вобласці за перыяд уборачнай таксама нічога сур'ёзнага не адбылося. Самае галоўнае ў рабоце ратавальнікаў — нагадаць пра бяспеку. У спісе галоўных патрабаванняў — сачыць пастаянна за тэхнічным станам машын і механізмаў, кожны дзень ачышчаць іскрагасільнікі ад нагару, мець пад рукой вогнетушыцель і памятаць нумар 112, па якім трэба выклікаць ратавальнікаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

ШКОЛУ ЗАКРЫЛІ. ШТО ЎЗАМЕН?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)

У сваю чаргу педагагічны калектыў перадаў туды сваю напрацаваную базу і міжнародныя кантакты па гэтым напрамку. На думку дырэктара, матэрыял сабраны актуальны, бо дзяцей з асаблівасцямі развіцця становіцца з кожным годам усё больш.

У размове закранулі і лёс самога будынка. Таццяна Аляксандраўна ведае пра тое, што яго плануюць перадаць сацыяльнай службе, і ўпэўнена, што былая школа пуставаць не будзе. Тут змогуць арганізаваць свой вольны час пажылыя гродзенцы. Яны зараз даволі актыўныя і шукаюць новыя магчымасці пасля выхаду на пенсію. Асаблівыя спадзяванні дырэктар звязвае

са школьным дваром, які цяпер выглядае такім квітнеючым. Аматары-кветкаводы змогуць праявіць тут сваю фантазію.

— У нас на тэрыторыі школы тры будынкі, — заўважае Таццяна Галавенка, — вялікі двор, ёсць сажалка, усё дагледжана, і будзе шкада, калі такая прыгажосць прыйдзе ў заняпад.

У Гродзенскім гарвыканкаме паведамілі, што мэр прыняў рашэнне перадаць аб'ект Цэнтру сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, каб стварыць тут нешта накшталт клуба для пенсіянераў. Маўляў, у Еўропе вельмі запатрабавана такая форма, калі пажылыя людзі сустракаюцца і разам праводзяць час за якім-небудзь заняткам.

У мікрараёне Грандзічы такі сацыяльны пакой ужо існуе. Ён знаходзіцца ў былым памяшканні фельчарска-акушэрскага пункта. Тут ёсць магчымасць авалодаць камп'ютарнай граматай, наведаць школу танцаў, музычную гасцёўню, прыйсці на аздараўленчыя заняткі, падвучыць англійскую і польскую мовы. Праўда, месца не так многа — для гэтых мэт адведзена ўсяго два пакоі. З пераходам сацыяльнай установы ў былую школу магчымасці значна пашырацца.

— Такія ўстановы вельмі запатрабаваны, — кажа **Наталья ГАГАУЗАВА, якая ўзначальвае аддзяленне для пажылых людзей у мікрараёне Грандзічы,** — у нас займаецца каля ста чалавек. Многія прыходзяць на адкрытыя мерапрыемствы, якія мы ладзім. Каляндар ёсць на нашым сайце, таксама звонім людзям асабіста.

Самыя папулярныя — камп'ютарныя курсы. На другім месцы — аздараўленчы гурток. Праўда, яго база знаходзіцца ў самім горадзе. Магчыма, ён пераедзе потым сюды. Але для заняткаў трэба будзе набываць і свой інвентар.

Зрэшты, гэта не самая вострая праблема будучага цэнтра. Сацыяльныя работнікі занепакоены раскладам транспартнага руху. Хоць гэта гарадская тэрыторыя, але даехаць сюды складана. Пенсіянерам трэба патраціць на праезд 2 рублі. Калі карыстацца маршруткай, будзе яшчэ даражэй. Аўтобусы ходзяць раз на гадзіну, і заняткі ў аддзяленні прымеркаваны пад іх расклад.

Магчыма, сітуацыя ў будучыні палепшыцца, бо мікрараён з'яўляецца перспектыўным у плане забудовы. Тут вызначаны плошчы як пад жылыя дамы, так і пад інфраструктуру. У прыватнасці, ёсць намер пабудаваць у ім і новую школу.

Што датычыцца старой навучальнай установы, то, на думку тых жа сацыяльных работнікаў, тут мэтазгодна стварыць такое месца, куды можна прыехаць на цэлы дзень. Напрыклад, для састарэлых, якім патрэбны догляд. Дапамогу гатовы аказаць Чырвоны Крыж. Умовы для гэтага ёсць — гарачая вада, санвузлы ў памяшканні. Неабходна толькі арганізаваць гарачае харчаванне. Гэта можна зрабіць на былой кухні.

Дарэчы, будынак школы быў на прыкмеце і ў гродзенскіх бізнесменаў. **Таццяна ЧЫСЦЯКОВА, кіраўнік фермерскай гаспадаркі і ўдзельнік трансгранічных праектаў,** лічыць, што тут добра было б размясціць турыстычную базу для веласіпедыстаў. Ёсць месца і для тэхнікі, і для адпачынку турыстаў. Будынак знаходзіцца недалёка ад трасы, якая вядзе ад Гродна да пункта пропуску «Прывалка» на беларуска-літоўскай мяжы. У гэтым раёне нямала веласіпедных маршрутаў, а базы для такіх турыстаў няма. Але ўзяцца за такі праект Таццяна не рызыкуе — занадта шмат бюракратызму на гэтым шляху, кажа яна.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

Раманія СКАМАРОШКА, старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа:

— Будынак былой школы знаходзіцца ў маляўнічым месцы. Не ва ўсіх пенсіянераў ёсць дачы, таму знаходжанне ў гэтым куточку прыроды будзе для іх вельмі карысным. Наколькі мне вядома, павінна адбыцца вывучэнне меркаванняў саміх пажылых людзей — што ім цікава? У любым выпадку Чырвоны Крыж гатовы рэалізаваць тут свае праграмы. У прыватнасці, весці заняткі па аказанні першай дапамогі, папулярызацыі здаровага ладу жыцця, прафілактыцы захворванняў. Таксама мы гатовы накіраваць сюды і нашы валанцёрскія атрады.

Таццяна СЛАБЫШ, начальнік упраўлення кантролю бюджэтна-фінансавай сферы Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці:

— У 2016 годзе планавалася ўвесці ў гаспадарчы абарот 36 былых аб'ектаў адукацыі, у асноўным школ. Але графік выкананы толькі на 25% (задзейнічана 9 былых устаноў). Астатнія 27 аб'ектаў адукацыі непрыстасаваны і прыходзяць у заняпад. Напрыклад, у Гродзенскім, Дзятлаўскім, Лідскім раёнах былыя школы і іншыя ўстановы адукацыі пустуюць па 5—10 гадоў.

ВЫВЕСЦІ НА

Доступ да цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння мае 98,5% гарадскога і каля 81% сельскага насельніцтва. Астатняе забяспечваецца вадой з лакальных дэцэнтралізаваных крыніц: шахтавых калодзежаў і дробнатрубчастых свідравін. Крыніцамі цэнтралізаванага водазабеспячэння служаць 10 197 артэзіянскіх свідравін і 1 водазабор з паверхневых крыніц, якасць вады забяспечваюць 598 станцый абезжалезвання, на вулічных сетках усталявана больш за 41 тыс. водаразборных калонак. Штосутачна ў сетку падаецца 1,6 млн м³ пітной вады.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)

Гігіенічныя нарматывы пітной вады ўстаноўлены ў санітарных нормах для цэнтралізаваных і нецэнтралізаваных сістэм пітнога водазабеспячэння. Вада нармуецца прыкладна па 1500 паказчыках. Але абавязкова кантралююцца толькі некалькі дзясяткаў з іх.

За якасцю вады сочаць як самі арганізацыі, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю сістэмы водазабеспячэння (водаканалы, прадпрыемствы сістэмы ЖКГ), так і тэрытарыяльныя цэнтры гігіены і эпідэміялогіі ў межах дзяржаўнага санітарнага нагляду.

Па словах Ірыны Жаўняк, падчас лабараторных даследаванняў на працягу апошніх 10 гадоў колькасць проб пітной вады з сеткі, што не адпавядаюць гігіенічным нарматывам па мікрабіялагічных паказчыках, стабільна трымаецца на ўзроўні менш за 1%. Па рэкамендацыях Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) гэты параметр не павінен перавышаць 5%. Значыць, нашу ваду можна піць з-пад крана без кіпячэння.

Паверхневыя ці падземныя?

Амаль усе жыхары краіны п'юць ваду з падземных крыніц. Толькі 1/3 частка Мінска забяспечваецца вадой з Вілейска-Мінскай воднай сістэмы. Але да 2022 года плануецца і іх перавесці на падземныя крыніцы.

Па словах **загадчыцы лабараторыі фактараў асяроддзя пражывання і тэхналогій аналізу рызык здароўю НПЦ гігіены Алены ДРАЗДОВАЙ,** вада з падземных крыніц у Беларусі не толькі бяспечная. У карысных суадносінах у ёй змяшчаюцца шматлікія мікраэлементы. Пры гэтым яна не патрабуе значнай дадатковай ачысткі.

А вось паверхневыя крыніцы, натуральна, больш схільныя да забруджвання, таму вада з іх патрабуе глыбейшай ачысткі з прымяненнем большай колькасці метадаў. Каб выдаліць усе магчымыя патагенныя арганізмы з такой вады, неабходна яе дэзынфікаваць. Сёння для гэтых мэт выкарыстоўваюць ультрафіялетавае апраменьванне, азанаванне і хлараванне. Апошні метад — найбольш распаўсюджаны, ён лічыцца самым надзейным і эканамічна выгадным. Каб эфект ад дэзынфекцыі захаваўся да паступлення спажыўцу, у вадзе застаецца рэшткавы хлор (норма — 0,3—0,7 мг/дм³). Лёгкі пах гэтага рэчыва — гарантыя, што вада з паверхневага вадазабору прайшла абеззаражванне.

«Жалезная» праблема

Разам з чысцінёй і карысцю нетры «падарылі» нашай вадзе і павышаную колькасць жалеза, марганцу, бору і некаторых іншых прыродных кампанентаў.

Высокая колькасць жалеза — адна з галоўных праблем вады ў Беларусі.

— Павышаная колькасць злучэнняў жалеза абумоўлена асаблівасцямі ваданосных гарызонтаў на тэрыторыі краіны, — расказала Ірына Жаўняк. — Каля 40% ад усіх свідравін падаюць ваду з колькасцю жалеза большай за гранічна дапушчальныя канцэнтрацыі. Асабліва актуальна гэта для Палесся.

Фота БЕЛТА.

Каб упэўніцца, што пітная вада дойдзе да спажыўца чыстай і бяспечнай, спецыялісты праводзяць яе хімічны аналіз.

Павышаная канцэнтрацыя жалеза не аказвае таксічнага ўздзеяння на арганізм чалавека, але надае вадзе спецыфічны «металічны» прысмак, а таксама садзейнічае павелічэнню мутнасці і колернасці, што абмяжоўвае спажыванне вады ў санітарна-бытавых мэтах. Беларускі нарматыў колькасці жалеза ў вадзе — да 0,3 мг/л. А вось на здароўе «жалезістая» вада, па даных СААЗ, пачынае ўплываць пры колькасці звыш 2 мг/л. Гэта той максімум, пры якім ваду яшчэ можна ўжываць у санітарна-бытавых мэтах. Таму СААЗ і дае такія рэкамендацыі.

Забяспечаць усіх

Праблема «жалезістай» вады паспяхова вырашаецца ў нашай краіне пры рэалізацыі дзяржаўнай праграмы (2002—2015 гг.), а з 2016 па 2020 г. — падпраграмы па водазабеспячэнні і водаадвядзенні «Чыстая вада». Дзяліцца пабудаваным за гэты час станцыям абезжалезвання доля неадпаведных проб па колькасці жалеза ў водаправоднай вадзе знізілася з 29,5% у 2005 годзе да 18,4% у 2016-м.

Па словах **галоўнага інжынера аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Ірыны САЛІВОНЧЫК,** дзякуючы рэалізацыі праграмы было пабудавана 582 аб'екты водазабеспячэння і водаадвядзення, у тым ліку станцыі абезжалезвання, каналізацыйныя ачыстныя збудаванні, на падземныя крыніцы водазабеспячэння перайшлі Полацк, Гродна і Гомель.

> Спецыялісты не рэкамендуюць піць ваду з лясных крыніц. Нягледзячы на знешнюю чысціню, яны могуць утрымліваць вялікую долю шкодных рэчываў, у тым ліку нітратаў.

У выніку ахопленасць цэнтралізаванымі сістэмамі водазабеспячэння гарадскога насельніцтва склала 98,4%, сельскага — 65,1% (аграгарадкоў — 78,9%). У параўнанні з 2004 годам на 13% і 19% павялічылася забяспечанасць цэнтралізаванымі і мясцовымі сістэмамі гаспадарча-бытавой каналізацыі гарадскога (92,5%) і сельскага (37,4%) насельніцтва.

— Да канца 2020 года плануецца забяспечыць пітной вадой нарматыўнай якасці 100% насельніцтва абласных і раённых цэнтраў, гарадоў абласнога падпарадкавання, якія маюць доступ да цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння, — расказала Ірына Салівончык. — Станцыі абезжалезвання запрацуюць амаль у 500 населеных пунктах краіны.

Пра што раскажуць трубы

Каб пітная вада дайшла да свайго спажыўца, часам ёй трэба пераадолець адлегласць у некалькі кіламетраў па трубах. І стан гэтых «праваднікоў» таксама адбіваецца на якасці вады.

Па санітарна-эпідэміялагічных патрабаваннях прадугледжваецца перыядычная прамыўка і санітарная апрацоўка водаправодных сетак. За правільным і своечасовым выкананнем гэтых работ сочаць спецыялісты тэрытарыяльных цэнтраў гігіены і эпідэміялогіі.

— На жаль, не заўсёды і не ў поўнай меры выконваюцца захады па прамыўцы і дэзынфекцыі сетак, — адзначыла Ірына Жаўняк. — Нягледзячы на тое, што гэта не толькі ў інтарэсах спажыўцоў, але і прадпрыемстваў ЖКГ, якія эксплуатуюць сістэмы і трубы. Такія працэдуры прадаўжаюць жыццё сістэмам водазабеспячэння, станоўча ўплываюць на якасць вады.

Калі ж адпаведная работа не праводзіцца, у тупіковых участках з малым водаразборам пачынаюць развівацца мікраарганізмы, якія пагаршаюць якасць пітной вады. Акрамя таго, размнажэнне жалезабактэрый можа прывесці да перакрыцця прасвету труб і выклікаць аварыі.

Па словах Ірыны Салівончык, гэта праблема вырашаецца. Сёння з 38 тыс. км водаправодных сетак маюць патрэбу ў аднаўленні 2,1 тыс. км. У асноўным такія работы ажыццяўляюцца штогадова ў перыяд падрыхтоўкі ЖКГ да работы ў асенне-зімні перыяд. Сёлета плануецца замяніць 328,5 км водаправодных сетак.

> У Расійскай Федэрацыі каля 70% насельніцтва п'е ваду з паверхневых крыніц, ва Украіне — каля 80%. Не адмаўляюцца ад вады з рэк, азёр, вадасховішчаў і вядучыя краіны Еўропы. У сталіцы Фінляндыі, напрыклад, атрымліваюць пітную ваду з возера Пяянэ. У Парыжы існуюць тры станцыі падрыхтоўкі вады, якія выкарыстоўваюць сістэму наземных рэк і вадаёмаў, свідравіны і падземныя крыніцы.

Сцёкі... у рэкі

Толькі частка вады затрымліваецца ў нашых кватэрах. Астатняя пасля выкарыстання трапляе у каналізацыю, за эксплуатацыю якой адказваюць водаканалы і шматпрофільныя арганізацыі ЖКГ.

Але часам каналізацыйныя сцёкі не даходзяць да ачышчальных збудаванняў ці дрэнна ачышчаюцца, забруджваючы глебу, водныя аб'екты, а затым — і падземныя воды.

Даныя даследавання паверхневых вод, якое праводзіцца арганізацыямі Мінпрыроды ў межах Нацыянальнай сістэмы маніторынгу, сведчаць пра паступовае зніжэнне ліку проб з павышанай колькасцю ў паверхневых водах шкодных прадуктаў.

У цэлым пераважная колькасць участкаў вадацёкаў (95,4%), ахопленых рэгулярнымі назіраннямі, адпавядаюць «добраму» і «выдатнаму» экалагічнаму статусу. Значную антрапагенную нагрузку зведваюць 4,6% паверхневых водных аб'ектаў, сярод якіх рэкі Свіслач (н. п. Каралішчавічы, Свіслач), Уза (10 км ад г. Гомеля), Заходні Буг і Мухавец (г. Кобрын), Уша (ніжэй г. Маладзечна), а таксама азёры Мёрскае, Лядно, Кагальнае і Асіповіцкае вадасховішча.

— Сёння гэта праблема вырашаецца дзякуючы будаўніцтву і рэканструкцыі ачыстных збудаванняў сцёкавых вод. Акрамя таго, для скарачэння аб'ёму забруджвальных рэчываў у складзе сцёкавых вод мясцовыя органы ўлады сталі больш актыўна прыцягваць для гэтых мэт замежныя інвестыцыі, пазыковыя сродкі камерцыйных арганізацый, крэдытныя рэсурсы, — адзначылі ў Мінпрыроды.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом №1 по генплану»

Сведения о застройщике.

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад», зарегистрированное Мингорисполкомом 05.01.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192400611.

Юридический адрес: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 4-107, тел./факс 234-16-99, тел. 234-16-98. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45. График приема граждан по вопросам долевого строительства отделом ЖСПК, долевого строительства и аренды – понедельник с 8.30 до 17.30 (обеденный перерыв с 13.00 до 13.45), вторник с 8.30 до 13.00, среда с 13.45 до 17.30, четверг с 8.30 до 13.00.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты: жилые дома № 4, 6 по ул.С.Есенина; жилой дом № 14а по ул. Короля; жилые дома № 12, 16, 22 по ул. Чюрлёниса; жилые дома № 3, 5, 7, 9 по ул. Я. Брыля; жилой дом № 12 по ул.Михаловской.

Цель проекта – строительство объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом № 1 по генплану».

Начало строительства объекта – 18.05.2017.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию – 17.08.2018.

Государственная экспертиза проектной и сметной документации: заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 08.09.2016 № 550-15/16 с дополнением от 04.04.2017 № 99-15/17.

Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка от 31.03.2017 № 500/729-1716.

Решение Мингорисполкома «О разрешении проведения проектно-изыскательских работ и капитального ремонта, строительно-монтажных работ по объекту, возведения объекта строительства» от 03.11.16 № 3229.

Разрешение Госстройнадзора на производство строительно-монтажных работ – № 2-203Ж-017/17 от 18.05.2017, 20.06.2017.

Генеральный подрядчик – ОАО «МАПИД» (договор строительного подряда № 25/01-2017 от 25.01.2017).

Жилой дом запроектирован 10-ти этажным, девятисекционным в конструкциях серии М 464-У-М с применением сборных железобетонных панелей, с техническим подпольем, теплым чердаком. Всего квартир – 339, в том числе: 1-комнатных – 85, 2-комнатных – 140, 3-комнатных – 104, 4-комнатных – 10. Общая площадь квартир – 21 010,53 кв. м. На первом этаже располагается помещение товарищества собственников с отдельным входом площадью 38,60 кв. м. В центральной части здания выполнен сквозной проход в объеме 1-го этажа.

Отделка наружных стен – покраска акриловыми фасадными красками, покрытие защитно-декоративным полимерным составом. Окна, остекление лоджий – ПВХ-профиль с заполнением стеклопакетами. Двери – деревянные с улучшенной масляной окраской. Входные двери в подъезд – металлические. В каждой секции предусмотрен лифт грузоподъемностью 630 кг, мусоропровод, поквартирный учет холодной и горячей воды, электроэнергии и тепла. Квартиры оборудованы автономными пожарными извещателями.

Проектом предусмотрена внутренняя отделка жилых помещений. Стены квартир – оклейка обоями в жилых комнатах, прихожих, кухнях, акриловая водостойкая окраска в ванных и санузлах. Покрытие полов квартир – линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове, керамическая неглазурованная плитка. Потолки квартир – акриловая покраска, оклейка обоями.

В состав общего имущества объекта входят помещение товарищества собственников, лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, кровля, технические и подвальные этажи, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений.

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается общая площадь жилых помещений дома в размере усредненного показателя 4,8%.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц предлагается 38 (тридцать восемь) квартир, в том числе:

- (15) 1-комнатных общей площадью 42,32 кв. м (квартиры №№ 2, 5, 6, 9, 13, 14, 18, 21, 25, 26, 29, 30, 33, 34 и 38) стоимостью строительства за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 050 долларам США**;
- (20) 2-комнатных общей площадью от 57,72 до 59,36 кв. м (квартиры №№ 1, 3, 4, 8, 11, 12, 15, 16, 20, 23, 24, 27, 28, 31, 32, 35, 36, 39, 41 и 42) стоимостью строительства за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 000 долларам США**;
- (3) 3-комнатных общей площадью 78,56 кв. м (квартиры № 40, 76 и 79) стоимостью строительства за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **950 долларам США**;

Стоимость строительства 1 кв. м общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора.

Условия оплаты – первоначальный взнос в размере 10% стоимости объекта долевого строительства в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – ежемесячно до конца строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

Для заключения договоров необходимы:

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор,

Документы для заключения договоров будут приниматься отделом ЖСПК, долевого строительства и аренды **с 15.08.2017,** понедельник с 8.30 до 17.30 (обед с 13.00 до 13.45), вторник с 8.30 до 13.00, среда с 13.45 до 17.30, четверг с 8.30 до 13.00 **по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, каб. 1, тел.: (017) 234-16-98, (044) 795-44-44**

ЧЫСТУЮ ВАДУ

ЯК ДАПАМАГЧЫ КАЛОДЗЕЖУ

— Звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі ці незалежную сертыфікаваную лабараторыю для аналізу вады (на платнай аснове).

— Забор вады можна даверыць спецыялісту ці зрабіць самому з абавязковым выкананнем усіх патрабаванняў (няправільны забор можа значна паўплываць на вынікі аналізу).

— Калі немагчыма пачысціць калодзеж уласнымі сіламі, можна заказаць такую паслугу ў прадпрыемствах сістэмы ЖКГ, а таксама ў індывідуальных прадпрымальнікаў.

Дзед піў, і я буду

Да гэтага часу многія людзі, асабліва ў сельскай мясцовасці, карыстаюцца нецэнтралізаванымі крыніцамі водазабеспячэння. І калі абслугоўваннем грамадскіх калодзежаў займаюцца арганізацыі ЖКГ ці сельскія Саветы, то за чысцінёй індывідуальных павінны сачыць гаспадары падворкаў, дзе яны размешчаны.

— Шахтавыя і трубчастыя калодзежы — самыя ненадзейныя крыніцы ў гігіенічным плане, — кажа Ірына Жаўняк. — Ваданосныя гарызонты, адкуль да іх паступае вада, знаходзяцца недалёка ад паверхні зямлі. Таму на якасць вады ўплываюць не толькі прыродныя з'явы (дождж, снег, засуха), але і жыццядзейнасць чалавека.

Размяшчэнне бліжэй за 25—30 м ад крыніц вады гаспадарчых пабудоў (хлявоў, памыйных ям), месцаў захавання ўгнаенняў ці актыўнае выкарыстанне апошніх на сваім агародзе, адсутнасць гліняных «замкоў» і адмостак — усё гэта можа стаць прычынай забруджвання калодзежаў.

Пры правядзенні абслугоўвання шахтавых калодзежаў камунальныя службы кіруюцца адпаведным СанПіНам, які прадугледжвае штогадовы аналіз вады, чыстку і дэзынфекцыю такіх аб'ектаў. Гэтымі ж нарматывамі павінны карыстацца і гаспадары індывідуальных калодзежаў.

— На жаль, сёння нельга карыстацца прынцыпам «мой дзед піў, значыць, добрая вада», — падкрэсліла Ірына Жаўняк. — Калі вы хочаце быць упэўненымі ў чысціні вады з вашага калодзежа, неабходна звярнуцца да спецыялістаў для правядзення адпаведных аналізаў.

Нітраты побач

Па даных Мінпрыроды, на ўчастках, што зведваюць антрапагеннае ўздзеянне, адзначаецца тэндэнцыя да павелічэння ў вадзе колькасці амонію, нітратаў, хларыдаў і іншых кампанентаў.

— Выпадкі перавышэння гігіенічных нарматываў выяўлены ў 58 свідравінах на 38 гідрагеалагічных пастах, — расказалі ў Мінпрыроды. — Найбольшая колькасць проб з павышэннем узроўню нітрат-іонаў — у грунтовых водах у басейне Прыпяці і ў напорных водах у басейне Дняпра.

У сельскай мясцовасці інтэнсіўнае забруджванне грунтовых вод адбываецца ў месцах размяшчэння жывёла- і птушкагадоўчых фермаў, складаў мінеральных угнаенняў і ядахімікатаў, палёў арашэння, а таксама на сельгасугоддзях, дзе ўносяцца мінеральныя і арганічныя ўгнаенні. Павышаная колькасць забруджвальных рэчываў рэгіструецца на глыбіні да 14—16 м.

— Пераход на ваду з цэнтралізаваных сістэм пітнога водазабеспячэння дзякуючы рэалізацыі праграмы «Чыстая вада» — найлепшы крок па вырашэнні нітратнай праблемы, — упэўнена Ірына Жаўняк. — Калі ж гэтага пакуль не адбылося, неабходна ўважліва сачыць за станам сваіх калодзежаў і гаспадарчых пабудоў, а таксама перыядычна рабіць аналіз вады.

Не нашкодзь!

Выкарыстанне вады на гаспадарча-бытавыя патрэбы застаецца асноўным складнікам водаспажывання Беларусі. Але ў параўнанні з 2009 годам удзельнае водаспажыванне на гэтыя патрэбы насельніцтва ў сярэднім па краіне скарацілася са 165 да 137 л/чал./сут. (у большасці краін Еўропы — 100—150 л/чал./сут.).

Дасягнуць гэтага ўдалося шляхам рэалізацыі Воднай стратэгіі Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года, а таксама Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2011—2015 гады.

— Ва ўмовах, калі глабальныя праблемы дэфіцыту прэснай вады ствараюць пагрозу для цяперашняга і будучага пакаленняў, наша краіна прымае дзейсныя меры па пераглядзе падыходаў у кіраванні воднымі рэсурсамі, якія выбудоўваюцца з улікам такіх сусветных прыярытэтаў, як павышэнне эфектыўнасці выкарыстання і паляпшэнне якасці водных рэсурсаў, збалансаваных з патрэбамі грамадства, — адзначылі ў Мінпрыроды.

Беларусь таксама мае абавязацельствы па выкананні Пратакола па праблемах вады і здароўя да Канвенцыі ЕЭК ААН па ахове і выкарыстанні трансгранічных вадацёкаў і міжнародных азёр. Адзін з галоўных прынцыпаў дакумента — каб патрэба цяперашняга пакалення ў водных рэсурсах здавальнялася без шкоды для магчымасцяў будучых пакаленняў.

Вераніка КОЛАСАВА.
kolasava@zviazda.by

Фота БЕЛТА.

Калі водаправодныя трубы не прамываць, на іх могуць назапашвацца шкодныя рэчывы.

МЕРКАВАННІ

Вы п'яце водаправодную ваду? Ці задавальняе вас яе якасць?

З такімі пытаннямі мы звярнуліся да людзей з розных арганізацый і населеных пунктаў Беларусі.

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах Вольга ПЕТРАШОВА, жыве ў Мінску і Магілёве:

— Я п'ю водаправодную ваду і ў сталіцы, і ў Магілёве. Але з-пад крана п'ю толькі халодную, а не цёплую ці гарачую. Гарачую, наколькі мне вядома, піць не варта. Перыядычна мы з сям'ёй здаём розныя аналізы — і ўсё ў парадку, мне здаецца, што вада добрая. Якасць вады ў абодвух гарадах мяне абсалютна задавальняе. Больш за тое, ад тых службаў, якія я курыравала, будучы ў прафсаюзах, ведаю, як чысціцца наша вада. Ці адрозніваецца вада ў Магілёве і Мінску? Па смакавых якасцях халодная вада з-пад крана аднолькавая. Фільтр у мяне ўсталяваны, але я не бачу сэнсу яго выкарыстоўваць.

Журналістка Юлія МАТУЗАВА, жыве на два гарады — Мінск і Наваполацк:

— Вада ў Наваполацку нашмат больш жорсткая, чым у Мінску. Мая сям'я лічыць, што піць ваду з-пад крана ў горадзе нельга. Ды і ніхто з маіх знаёмых яе не п'е. Можа, такія перасцярогі склаліся ва ўсіх, таму што ў горадзе шмат заводаў і неспрыяльная экалагічная абстаноўка. Ужо некалькі гадоў у нас у кватэры стаяць фільтры для ачысткі і змякчэння вады. Але для пітва мы ўсё роўна купляем бутыляваную ваду. Ведаю, што многія карыстаюцца адмысловымі ёмістасцямі з фільтрам для ачысткі вады. Я з невялікага беларускага горада і бачу розніцу паміж мінскай і нашай вадой. У Мінску яна лепшай якасці. Але п'ю ўсё роўна бутыляваную.

Загадчыца аддзялення камунальнай гігіены дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя» Ірына ЖАЎНЯК:

— Так, я п'ю водаправодную ваду ў сталіцы. Я наогул не купляю бутыляваную ваду. Пражываю ў Сухараве, а працую на вуліцы Клары Цэткін. У абодвух месцах вада паступае з паверхневага водазабора. Як спецыяліст, магу ўпэўнена заявіць — вада бяспечная. Лёгкі пах хлору павінен адчувацца ў вадзе, таму што гэта служыць гарантыяй таго, што працэс абеззаражвання прайшоў правільна. Колькасць хлору ў пітной вадзе рэгламентуецца як міжнароднымі, так і нацыянальнымі нарматывамі. Яны разлічаны такім чынам, каб забяспечвалася поўная дэзынфекцыя вады, але без уплыву на здароўе людзей. Што датычыцца асабіста мяне, то спакойна стаўлюся да наяўнасці хлору.

Інжынер-энергетык Мар'ян МАЦКЕВІЧ, жыве ў г. Баранавічы:

— З большага з вадой у Баранавічах нядрэнна. Піць яе можна. У старых раёнах водазабеспячэнне ажыццяўляецца са свідравін, у новых вада мае невялікі прысмак хлору. Канкрэтна ў нашым доме вада добрая, але мы дадаткова ездзім да крыніцы. Яна знаходзіцца каля вёскі Тартакі ў Баранавіцкім раёне. Крыніца карыстаецца асаблівай папулярнасцю ў мясцовых, нярэдка ў гэтым месцы збіраецца нават чарга з аўтамабіляў.

Намеснік старшыні Добрушскага раённага выканаўчага камітэта Сяргей ПЯТРОЎСКІ:

— П'ю выключна водаправодную, таму што ад кіпячонай вады ў мяне пяршыць у горле. Якасць вады ў Добрушы сапраўды добрая, у нас тры водазаборы. Бываюць, вядома, зрывы, калі паступае дрэнная вада, але гэта звязана з рамонтам сетак. У цэлым жа па нашым раёне праблем з вадой вельмі шмат. Чаму? Таму што ў нас ёсць населеныя пункты, далучаныя да сельскагаспадарчых свідравін. У такіх гарадах і вёсках зашкальвае ўзровень жалеза, каляровасць і мутнасць таксама прысутнічаюць. Як гэта выправіць? Ёсць два спосабы. Першы — укласці грошы і зрабіць добрыя свідравіны, другі — паставіць станцыю абезжалезвання. Калі выбраць першы варыянт, то выдаткі на падачу вады будуць мінімальныя. Другі варыянт дрэнны тым, што потым трэба ўвесь час мяняць рэагенты і несці дадатковыя выдаткі.

Начальнік аддзела арганізацыйнай работы ўнітарнага прадпрыемства «Мінскводаканал» Кацярына КАЛЮГА:

— Так, я п'ю ваду з-пад крана. Я жыву ў Фрунзенскім раёне сталіцы, і ў нашым доме праблем з каляровасцю вады не назіраецца. Смакавыя якасці таксама ў норме. Згодна з СанПіН 10-124 РБ99 (а гэта галоўны дакумент, які рэгламентуе паказчыкі якасці вады ў нашай краіне), якасць водаправоднай вады ў нашым горадзе адпавядае ўсім нарматывам. Як супрацоўнік «Мінскводаканала», яшчэ раз магу пацвердзіць — пробы, якія адбіраюцца штодня ў кантрольных пунктах на сетках, не выходзяць за рамкі гранічна дапушчальнай канцэнтрацыі. Аднак у пытанні якасці вады з крана мае значэнне і стан унутрыдамавых камунікацый. Калі прысутнічае пах хлору, можна проста адстойваць або кіпяціць ваду перад ужываннем.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ. *lukashevich@zviazda.by*

Управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Поставский льнозавод» (УНП 300563964)	
Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот №1.** Льноволокно короткое №2, в количестве 18000 кг., общей стоимостью 7292 рубля 00 копеек; **Лот №2.** Веревка льняная, в количестве 3000 кг., общей стоимостью 4065 рублей 00 копеек
Наличие обременений	нет
Местонахождение имущества	Поставский р-н., г. Поставы, ул. Заводская,1
Место, дата и время проведения торгов	28.08.2017 г. в 10.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб.1.3
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витобл-исполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by) Судебный исполнитель – Зиновенко Олег Олегович тел/факс: (80212) 610422, (8033) 6879159.
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витобл-исполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 25.08.2017 г. Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота). В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

Открытое акционерное общество «Черметремонт» в соответствии с решением наблюдательного совета (протокол №8 от 28 июля 2017 г.) 18 августа 2017 г. проводится ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Черметремонт»

Место проведения собрания – Минский р-н, п. Гатово, ОАО «Черметремонт», актовый зал, время проведения собрания – 15.00. Место и время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 14.00 до 15.00 по месту его проведения.

Повестка дня:

1. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Черметремонт».

2. Утверждение Положения о наблюдательном совете ОАО «Черметремонт».

УНП 600068756

Утерянный диплом на фамилию Сташевской А. С., выданный УО «Профессионально-техническое училище № 38», считать недействительным.

В связи с утерей документов считать недействительными Устав и свидетельство о регистрации №01-0118 от 28.06.2001 г. Брестского областного благотворительного общественного объединения помощи отделениям хронического гемодиализа и нефрологии.

В связи с утерей печать Брестского областного благотворительного общественного объединения помощи отделениям хронического гемодиализа и нефрологии считать недействительной.

ЗАКОН ЗАХАВАННЯ

НІЧОГА ЛІШНЯГА!

У Чавускім раёне рэалізуецца ўнікальны праект, які дасць магчымасць эканоміць у год тоны каштоўнага прыроднага рэсурсу.

А яшчэ паменшыць спажыванне цяпла, энергарэсурсаў і знізіць парніковы эфект. Праект «Сістэма аўтаматызацыі працэсу ўліку выдаткаванай энергіі і вады: беражыце ваду» рэалізуецца на базе Чавускага Жылкамгаса за кошт сродкаў Еўрапейскага саюза. Першы транш прадпрыемства атрымала ў сакавіку 2015 года, другі — мінулай восенню, канчатковы разлік будзе зроблены пасля рэалізацыі праекта — у канцы гэтага года. У цэлым праект ацэньваецца болей чым у 595 тысяч еўра. З іх каля 476 тысяч — гэта сродкі ЕС. Жылкамгас і Чавускі райвыканкам, якія выступаюць сузаснавальнікамі, павінны таксама ўнесці сваю лепту.

Рэалізаваць гэты праект было б немагчыма, калі б Чавусы ў 2014 годзе не далучыліся да еўрапейскай ініцыятывы «Пагадненне мэраў» і не ўзялі на сябе абавязацельствы па зніжэнні выкідаў CO_2.

— У Беларусі мы сталі аднымі з першых у гэтым кірунку, — кажа **старшыня Чавускага раённага Савета дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН**, які на той момант якраз узначальваў раённую вертыкаль. — Праект абяцаў вырашыць цэлы шэраг камунальных праблем, у прыватнасці, далучыць тую энергію, якую выпрацоўвае наша кагенерацыйная ўстаноўка, да агульнай сеткі і забяспечыць атрыманне таннай электраэнергіі для сваіх патрэб. Нам проста неабходны былі тыя грошы, якія гарантавала перамога праекта ў міжнародным конкурсе. Мы заручыліся падтрымкай аблвыканкама і звярнуліся ў тэхнапарк, дзе нам дапамаглі ўсе нашы напрацоўкі ўвязаць з сістэмай АСКУЭ (аўтаматызаваная сістэма кантролю ўліку энерганосьбітаў). Вельмі спатрэбіўся вопыт нямецкіх калег. У складзе дэлегацыі дырэктар нашага Жылкамгаса пабываў у Германіі. Паглядзеў, як там функцыянуе сістэма дыспетчарызацыі, і застаўся пад уражаннем. У рамках рэалізацыі праекта арганізоўваем адукацыйныя семінары. Тлумачым насельніцтву, з чаго складаюцца затраты, схематычна паказваем прычыны страты вады. Падлічылі, колькі вады збягае дарма, памножылі на тысячу чалавек і жахнуліся — гэта каласальныя сродкі.

Перадавыя пляцоўкі Чавусаў

— У краіне існуе праблема страты вады, але ліквідаваць яе можна, толькі стварыўшы ўлік спажывання гэтай прыроднай каштоўнасці, — канстатуе Анатоль Мацюлін. — Сёння нельга прасачыць, наколькі эфектыўна функцыянуе сістэма забеспячэння вадой. Ёсць тэхнічныя непаладкі, якія прыводзяць да таго, што свідравіна працуе сама на сябе. Што зрабіць, каб гэтага пазбегнуць? Правесці поўную дыспетчарызацыю. Толькі так мы зможам падлічыць, колькі атрымалі вады і колькі рэалізавалі. У астатку і будуць нашы страты. Прычым бачыць мы будзем не проста па сістэме ў цэлым, а па кожнай свідравіне паасобку. І дакладна ведаць, колькі электраэнергіі спатрэбіцца на здабычу пэўнай колькасці вады.

Сёння ўжо ўсё гатова для праходжання экспертызы, пасля якой можна будзе цалкам завяршыць праект. За кошт донарскіх грошай праводзіцца дыспетчарызацыя артэзіянскіх свідравін, ствараецца смарт-сістэма для маніторынгу і кіравання водазабеспячэннем, мадэрнізуецца цэнтральны каналізацыйны калектар, укараняецца тэхналогія біяачысткі сцёкаў, а таксама аўтаматызаваная сістэма камерцыйнага ўліку спажывання электраэнергіі і цяпла. Практычна завершана падрыхтоўка грамадскага інфармацыйнага цэнтра «Вада і энергія», размешчанага на базе разлікова-касавага цэнтра Жылкамгаса.

— У канцы жніўня мы ўжо атрымаем тры стэнды, — расказвае **менеджар праекта Ганна ШЭНДЗЕРАВА.** — Стэнд «Цёплыя сцены», напрыклад, дазволіць разлічыць цеплавую энергію. З яго дапамогай можна будзе змадэляваць розныя сцены (драўляныя, цагляныя і гэтак далей) рознай таўшчыні і даведацца аб ступені іх цеплаправоднасці. Стэнд «Каштоўная вада» дазволіць разлічыць, на чым мы часцей за ўсё губляем ваду. А стэнд «Энерга Паядынак» дасць магчымасць прааналізаваць, у колькі абыдзецца, напрыклад, падагрэў вады ў электрачайніку, звычайным чайніку і мікрахвалёўцы. Акрамя гэтага, у агульны камплект уваходзіць 3 кейсы, з дапамогай якіх можна будзе наглядна паказаць, як найбольш эфектыўна выкарыстоўваць ваду, цяпло і электрычнасць.

У інфармацыйным цэнтры будуць дэманстравацца тэматычныя фільмы, праводзіць сярод насельніцтва ўрокі камунальнай адукаванасці. Дарэчы, папулярызацыя праекта вядзецца ўжо другі год. Сумесна з экалагічным грамадскім аб'яднаннем «ЭНДО» Жылкамгас праводзіць інфармацыйныя гадзіны на тэму энерга- і водазберажэння ў школах, розныя акцыі, дні альтэрнатыўнага транспарту.

— Работы яшчэ непачаты край, — уздыхае Анатоль Мацюлін. — Асабліва гэта датычыцца выхавання насельніцтва. Чалавек павінны ведаць, колькі рэальна каштуюць камунальныя паслугі. Пакуль гэтыя сумы часткова кампенсуюцца за кошт перакрыжаванага субсідзіравання нашымі прадпрыемствамі. Але калісьці насельніцтву ўсё роўна прыйдзецца кампенсаваць кошт камунальных паслуг цалкам.

Ганна ШЭНДЗЕРАВА і Анатоль МАЦЮЛІН у інфармацыйным цэнтры для насельніцтва.

Дыспетчарызацыя сістэмы

Для дыспетчарскай, якая размесціцца ў адміністрацыйным будынку Жылкамгаса, таксама ўжо закуплена неабходная мэбля, шафа кіравання і камп'ютар. Хутка тут установяць смарт-сістэму, якая будзе абагульняць даныя па ўсіх 116 аб'ектах — цеплавых пунктах, кацельных, станцыях абезжалезвання, кагенерацыйнай устаноўцы, ачышчальных збудаваннях... Цеплапункты і свідравіны абсталююць GSM-датчыкамі і рэгулятарамі.

— Самыя вялікія страты вады адбываюцца на пускавых сістэмах, — сведчыць Анатоль Мацюлін. — Частотныя рэгулятары дапамогуць больш плаўна ўключаць і выключаць абсталяванне. Калі нешта зламаецца, аператыўна можна будзе наладзіць. А карыстальнік паслуг, у сваю чаргу, зможа ў рэжыме рэальнага часу паглядзець, колькі ён спажыў каштоўных рэсурсаў у маштабах сваёй кватэры, дома, і нават параўнаць сябе з суседзямі.

Работа ў рамках падобных праектаў аб'яднала некалькі краін-удзельніц усходняга партнёрства — Беларусь, Арменію, Украіну, Грузію, Малдову.

— Пакуль праводзяцца сумесныя адукацыйныя семінары, а калі праекты запрацуюць у поўную моц, мы будзем ладзіць дэманстрацыйныя візіты, — кажа Ганна Шэндзерава. — Еўрапейская камісія на працягу 5 гадоў будзе прыязджаць да нас і паказваць, што мы яшчэ можам дасягнуць.

Ужо сёння на сайце Жылкамгаса размешчаны 10 калькулятараў, з дапамогай якіх спажывец можа навучыцца эканоміць грошы і рэсурсы. Карысна даведацца, якія страты электрычнасці адбываюцца толькі з-за таго, што мы пакідаем бытавыя прыборы ўключанымі ў разетку. Тэхніка знаходзіцца ў рэжыме чакання, але лічыльнік усё роўна «матае». Ці, напрыклад, можна даведацца, якую лямпачку лепш купіць. Спецыяльны калькулятар раскажа пра ўсе плюсы і мінусы гэтага тавару.

— Мы правялі энергааўдыт праекта і прышлі да высновы, што пры яго рэалізацыі зніжэнне выкідаў CO_2 па горадзе складзе 2200 тон у год, эканомія электраэнергіі — 5 тысяч МВт у год, а вады 75 тысяч кубоў, — кажа Ганна Шэндзерава. — Лічбы, пагадзіцеся, пераканаўчыя.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

ПІЦЬ БУДЗЕМ?

КАБ САПСАВАЎСЯ СМАК ВАДЫ, ПАТРЭБНЫЯ ГАДЫ

Ад чаго пакутуюць вясковыя калодзежы

Здаўна лічылася, што смачнейшай і карыснейшай за калодзежную ваду можа быць хіба што крынічная. Аднак часам якасны напой схаваны так далёка ў зямлі, што спецыялісты — прынамсі, у Гродзенскай вобласці — раяць шукаць яго на глыбіні 80 метраў і ніжэй. А здаралася, што, напрыклад, у Ашмянскім раёне ваду і зусім не знаходзілі, калі білі свідравіну. Як, напрыклад, у вёсцы Зноскі, куды камунальнікі ўжо пяць гадоў возяць пітную ваду, бо ваданосны слой там паглыблены больш як на 100 метраў.

— Пошукі вады — гэта латарэя. Ці пашанцуе знайсці падземную ваду, дакладна ніхто не скажа. Тым больш што людзі часта самастойна вырашаюць, дзе рабіць калодзеж, без падказкі спецыялістаў, — кажа **Вадзім ПАШКОЎСКІ, намеснік старшыні Ашмянскага райвыканкама.** — *А імкнуцца паглыбіць стары калодзеж, які функцыянуе на паверхневых водах, каб дабрацца да глыбінных, проста небяспечна. Я параіў бы замест калодзежа ўсё ж пракладаць трубаправод або рабіць свідравіну.*

Па нормах СанПіНа пры эксплуатацыі калодзежаў павінны выконвацца наступныя патрабаванні: герметызацыя швоў паміж кольцамі, гліняны «замок» вакол калодзежа, адмостка, накрыўка. Ад калодзежа да пабудоў і праезнай часткі павінна быць пэўная адлегласць.

Раней, капаючы калодзежы, на гэта мала хто звяртаў увагу. Будавалі іх каля дарог, не герметызавалі швы, не рабілі накрыўкі. Часта яны стаяць нават не вертыкальна — бо недзе не даў прайсці вялікі камень або проста крыху ўбок. У выніку атрымліваецца ўхіл, кольцы лопаюцца, даюць трэшчыны, калодзеж становіцца аварыйным, туды трапляюць паводкавы бруд і нават «хімія», што змываецца з агародаў з дажджамі. Праз гэта церпіць якасць вады.

— Часцей за ўсё калодзежы пакутуюць на заільванне — можна да метра выбраць пяску ды зямлі пры расчыстцы. Калі калодзеж драўляны, а такія захаваліся ў раёне, чысціць яго павінна спецыяльная машына з іласосам. У нас такой няма, бо і падобных заявак амаль не паступае, — расказаў **Вячаслаў ЯНКОЎСКІ, намеснік дырэктара Ашмянскага РУП ЖКГ.**

Пачысціць і прахларыраваць звычайныя пітныя і каналізацыйныя калодзежы не ў аварыйным стане і не глыбейшыя за 12 метраў камунальнікі могуць. У мясцовай ЖКГ для гэтага існуе спецыяльнае звяно. Для работы на большай глыбіні патрэбна ўжо спецыяльнае абсталяванне і адпаведная падрыхтоўка.

Дарэчы, калі вясковы жыхар хоча правесці ў хаце водаправод ад свайго калодзежа, спецыялісты жыллёвай гаспадаркі могуць аказаць кансультацыйную дапамогу. Распрацуюць тэхнічныя ўмовы і растлумачаць, дзе і як пракладваць трубы і ўсталёўваць ёмістасць для збору водных адходаў, каб не пацярпела ўласная і суседская зямля.

— Увогуле, вада ў калодзежы псуецца вельмі рэдка. Для гэтага туды павінна нешта трапіць: ад выпадковага прадмета адзення ці птушкі да паводкавых водаў, што пройдуць паміж кольцамі, — кажа Вячаслаў Янкоўскі. *— Акрамя таго, калодзежам трэба рэгулярна карыстацца, каб ён не заіліўся і вада не страціла добрыя якасці. Аднак на тое, каб сапсаваўся яе смак, патрэбныя гады.*

У Ашмянскім раёне, сцвярджаюць спецыялісты, ёсць і такія калодзежы, што стаяць літаральна за метр ад ракі і амаль на ўзроўні з ёю. Чэрпаць адтуль можна проста вядром, не нахіляючыся, і вада крынічная, смачная...

Калі ўсё ж калодзежная вада не адпавядае вашаму густу, можна звярнуцца ў мясцовую ЖКГ, каб правесці яе аналіз. Калі вада проста мае непрыемны пах, можа быць, дастаткова адпампаваць старую ваду і пачакаць, пакуль калодзеж напоўніцца свежай. Здараецца, што падчас вычэрпвання гаспадары самі знаходзяць у вадзе прычыну непрыемнасцяў. Можна таксама набыць спецыяльную таблетку, якая ўкідваецца ў калодзеж і ачышчае ваду. Выклікаць спецыялістаў, каб чысціць калодзеж і хларыраваць яго, лепш пасля таго, як не дапамагла замена вады.

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «КЛАССНОЕ ЛЕТО С БЕЛКАРТ!»

БЕЛКАРТ
Тебе ближе

Организатор рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак». УНП 192325716, 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, этаж 3.

Наименование рекламной игры: «Классное лето с БЕЛКАРТ!».

Территория проведения: Республика Беларусь.

Срок начала и окончания рекламной игры: игра проводится с 1 июня 2017 года по 24 августа 2017 года.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь (свидетельство о государственной регистрации №2998 от 15 мая 2017 года).

Сведения о количестве участников рекламной игры: в игре приняли участие 972 (девятьсот семьдесят два) человека.

Сведения о розыгрыше призового фонда: призовой фонд (72 приза), общий размер которого составляет 15 159 (пятнадцать тысяч сто пятьдесят девять) белорусских рублей 00 копеек разыгран полностью.

Список победителей 1 розыгрыша:

Приз первого порядка – Подарочный сертификат «Универсальный подарочный сертификат Surprise.by на сумму 100 рублей»

1	Сержантов Николай Павлович, д. Березовка
2	Арабей Татьяна Николаевна, г. Пружаны
3	Граш Виктор Викторович, г. Минск
4	Павленко Наталья Николаевна, г. Гомель
5	Столяренко Валентина Васильевна, г. Речица
6	Дроздова Наталья Анатольевна, г. Гомель
7	Шуманская Татьяна Михайловна, г. Минск
8	Ильяшенко Андрей Петрович, г. Могилев
9	Гурко Екатерина Николаевна, г. Лепель
10	Цвечковская Светлана Михайловна, г. Гродно
11	Овсянникова Виктория Александровна, г. Волковыск
12	Швейба Сергей Алексеевич, г. Витебск
13	Славникова Галина Владимировна, г. Минск
14	Марфель Александр Владимирович, г. Могилев
15	Пташкевич Андрей Владимирович, г. Брест
16	Шилец Татьяна Петровна, д. Чкалово
17	Рыбалко Игорь Юрьевич, а. г. Гатово
18	Паращенко Ольга Сергеевна, г. Гомель
19	Барздова Полина Геннадьевна, г. Минск
20	Рожковская Елена Марьяновна, г. Минск

Приз первого порядка – Подарочный сертификат на экскурсии и отдых по РБ номиналом 150 рублей стоимостью 150,00 бел. руб. + денежная сумма в размере 5,83 бел. руб.

1	Ломан Михаил Степанович, г. Минск
2	Бобр Елена Васильевна, г. Мозырь
3	Граш Виктор Викторович, г. Минск
4	Янушкевич Ирина Петровна, г. Минск
5	Змушко Ирина Геннадьевна, г. Минск
6	Хвалько Андрей Алексеевич, г. Минск
7	Таранко Екатерина Александровна, г. Минск
8	Новикова Надежда Владимировна, г. Полоцк
9	Кривощекая Татьяна Владимировна, г. Минск
10	Татаренко Ольга Николаевна, а. г. Веремейки

Приз второго порядка – Подарочный сертификат на экскурсии и отдых по РБ номиналом 380 рублей стоимостью 380,00 бел. руб + денежная сумма в размере 40,20 бел. руб

1	Шуманская Татьяна Михайловна, г. Минск
2	Дащинская Наталья Александровна, г. Борисов
3	Пашкина Юлия Николаевна, г. Минск
4	Раемская Ирина Александровна, г. Могилёв
5	Манкевич Ирина Игоревна, г. Светлогорск

Главный приз – Подарочный сертификат на экскурсии и отдых по РБ номиналом 1685 рублей стоимостью 1 685,00 бел. руб + денежная сумма в размере 235,20 бел. руб.

1	Остапенко Владимир Иванович, г. Речица

Список победителей 2 розыгрыша:

Приз первого порядка – Подарочный сертификат «Универсальный подарочный сертификат Surprise.by на сумму 100 рублей».

1.	Ясюченя Ирина Николаевна, д. Большой Тростенец
2.	Васкевич Иван Александрович, г. Минск
3.	Тилитен Елена Александровна, г. Столин
4.	Манкевич Ирина Игоревна, г. Светлогорск
5.	Солдаткина Светлана Андреевна, г. Витебск
6.	Славникова Галина Владимировна, г. Минск
7.	Кочева Юлия Александровна, г. Гродно
8.	Шуманская Татьяна Михайловна, г. Минск
9.	Супранёнок Виолетта Петровна, г. Сморгонь
10.	Бобако Игорь Ильич, г. Крулевщина
11.	Бобр Елена Васильевна, г. Мозырь
12.	Беляк Николай Вячеславович, г. Ельск
13.	Пугач Евгений Михайлович, г. Смолевичи
14.	Иванова Нина Ивановна, г. Петриков
15.	Шумилин Николай Иванович, а/г Ждановичи
16.	Студент Екатерина Ивановна, г. Минск
17.	Коршун Анна Ивановна, г. Минск
18.	Столяр Елена Станиславовна, г. Барановичи
19.	Шутова Наталья Анатольевна, г. Могилев
20.	Полтусев Сергей Иосифович, г. Минск

Приз первого порядка – Подарочный сертификат на экскурсии и отдых по РБ номиналом 150 рублей стоимостью 150,00 бел. руб + денежная сумма в размере 5,83 бел. руб.

1.	Кутовенко Юлия Владимировна, г. Брест
2.	Шишковец Ирина Александровна, г. Минск
3.	Вашук Татьяна Николаевна, г. Минск
4.	Саванович Валентина Николаевна, г. Минск
5.	Хвалько Андрей Алексеевич, г. Минск
6.	Карпейкина Марина Петровна, г. Жодино
7.	Аскерко Андрей Алексеевич, г. Мозырь
8.	Рудый Максим Александрович, г. Волковыск
9.	Ламеко Татьяна Анатольевна, г. Слоним
10.	Дроздова Анна Александровна, г. Минск

Приз второго порядка – Подарочный сертификат на экскурсии и отдых по РБ номиналом 380 рублей стоимостью 380,00 бел. руб + денежная сумма в размере 40,20 бел. руб.

1.	Лось Марина Антоновна, г. Браслав
2.	Дещиц Татьяна Александровна, г. Минск
3.	Ярещенко Ольга Анатольевна, г. Гродно
4.	Черепович Виктор Николаевич, г. Минск
5.	Шклярова Ирина Николаевна, г. Могилев

Главный приз – Подарочный сертификат на экскурсии и отдых по РБ номиналом 1685 рублей стоимостью 1 685,00 бел. руб + денежная сумма в размере 235,20 бел. руб.

1.	Ясюченя Ирина Николаевна, д. Большой Тростенец

Поздравляем победителей!

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: 8 (033) 335 51 10

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе со снижением цены по продаже здания административно-бытового корпуса, Минская обл., Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 4

Лот №1. Четырехэтажное здание административно-бытового корпуса смешанной конструкции с инв. №630/С-39622. Составные части – три кирпичных тамбура, открытая терраса; г. п. – 1981; Этажность – 4; Общая площадь – 1 262,00 кв. м. Фундамент – ж/бетонный; Стены наружные и внутренние – крупнопанельные, кирпичные; Перегородки – кирпичные, гипсолитовые; Перекрытия – ж/бетонные; Крыша – рулонная совмещенная; Полы – дощатые, плиточные, паркетные; Проемы оконные – створчатые, окрашены, с приборами; Проемы дверные – филенчатые, окрашены, с приборами; Наружная отделка – расшивка швов, облицовка плиткой; Внутренняя отделка – оштукатурено, облицовано, оклейка обоями; Отопление – есть; Водопровод, канализация – есть; Горячее водоснабжение – есть; Электроснабжение – скрытая проводка; Радио, телефон – есть; Вентиляция – естественная, вентканалы.

Начальная цена продажи – 201 204,00 бел. руб.
Задаток – 20 120,00 бел. руб. Шаг аукциона 5%

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 642000000003000131, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 4, пл. 2,9014 га. Назначение – земельный участок для обслуживания производственной базы. На праве постоянного пользования. ОБРЕМЕНЕНИЯ: охранная зона линий связи и радиофикации, пл. 0,0832 га; охранная зона линии электропередачи (подземные кабельные линии напряжением до 10 кВ), пл. 0,1242 га; охранная зона линии электропередачи (подземные кабельные линии напряжением свыше 10 кВ), пл. 0,0854 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,5139 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, пл. 0,3784 га; охранная зона сетей и сооружений канализации (ливневая канализация), пл. 0,5420 га; охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, пл. 0,4565 га. На земельном участке находятся иные объекты, не выставляемые на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Аренда части здания (137,60 кв. м) до 31.12.2017

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Аукцион состоится 14.09.2017 г. в 14.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Здание АБК) (Лот №1), проводимом 14.09.2017 (Молодечненский МРО).
Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00.
Окончание приема заявлений – 12.09.2017 г. в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона.
Контактное лицо для осмотра Объекта: Лаптев Игорь Сергеевич – 8 (017-6) 53-31-99; 8 (029) 862-45-45

Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by

Извещение о проведении первых и повторных открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221280610101000885, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг. Ольгово, ул. Солнечная, 8 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничений в использовании нет. **Нач. цена:** 6 838,25 руб. **Задаток:** 683,83 руб.

Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221280601101000408 площадью 0,1498 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг. Бабиничи, ул. Больничная для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничений в использовании нет. **Нач. цена:** 3 323,91 руб. **Задаток:** 332,40 руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 11.09.2017 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 10.08.2017 с 8.30 по 08.09.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY23AKBB36003140100360000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Бабиничский сельисполком). **Условия:** получить в отделе архитектуры и строительства Витебского райисполкома техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; приступить к занятию зем. участка не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения); осуществить строительство жилого дома в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка.

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №223350100001002383 площадью 0,1003 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, г. Миоры, ул. Изварина, 20А, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Миорское); охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000В. **Нач. цена:** 4 218,77 руб. **Задаток:** 421,88 руб. Реквизиты для внесения задатка: р/с BY94AKBB36003210000000000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 3000594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Миорский райисполком)

Дата, время и место проведения аукциона: 12.09.2017 в 11.30 по адресу: г. Миоры, ул. Дзержинского, 17 в Миорском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 10.08.2017 с 8.30 по 11.09.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Условия:** получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома, в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство приступить к занятию зем. участка, осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка.

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №223381712101000029 площадью 0,0934 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Заутьевский с/с, д. Мазурино для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки Западная Двина. **Нач. цена:** 1 500 руб. **Задаток:** 150 руб.

Лот №2. Земельный участок с кадастровым №223383503601000014 площадью 0,1351 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Перебродский с/с, х. Гентово (участок №1) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Сумовка. **Нач. цена**: 3 300 руб. **Задаток:** 330 руб.

Лот №3. Земельный участок с кадастровым №223383503601000015 площадью 0,1362 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Перебродский с/с, х. Гентово (участок №2) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Сумовка. **Нач. цена**: 3 300 руб. **Задаток:** 330 руб.

Лот №4. Земельный участок с кадастровым №223383503601000016, площадью 0,1338 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Перебродский с/с, х. Гентово (участок №3) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Сумовка.
Нач. цена: 3 300 руб. **Задаток:** 330 руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 12.09.2017 в 11.00 по адресу: г. Миоры, ул. Дзержинского, 17 в Миорском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 10.08.2017 с 8.30 по 11.09.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатков: по лоту №1:** р/с BY89AKBB36003210300380000000 «АСБ «Беларусбанк, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Заутьевский сельисполком); **по лотам №2-4:** р/с BY09AKBB36003210700720000000 ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Перебродский сельисполком). **Условия аукциона:** приступить к занятию зем. участка в течение 1 года после получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации права на него; в месячный срок после получения решения получить в отделе архитектуры и строительства райисполкома АПЗ и ТУ на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства; разработать и утвердить ПСД, приступить к строительству объекта после разработки и утверждения строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка.

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221284810101000092 площадью 0,1414 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок 1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое).
Нач. цена: 4 000 руб. **Задаток:** 400 руб.

Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221284810101000094 площадью 0,1336 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок 4 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое).
Нач. цена: 4 000 руб. **Задаток:** 400 руб.

Лот №3. Земельный участок с кадастровым №221284810101000097 площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок №6, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое).
Нач. цена: 4 000 руб. **Задаток:** 400 руб.

Лот №4. Земельный участок с кадастровым №221284810101000096 площадью 0,1439 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок №7, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, водоохранная зона рек и водоемов (р.Западная Двина, оз. Белое).
Нач. цена: 4 000 руб. **Задаток:** 400 руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 25.08.2017 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 10.08.2017 с 8.30 по 24.08.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатков:** р/с BY20AKBB36003140801090000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Летчанский сельисполком). **Условия:** получить в отделе архитектуры и строительства Витебского райисполкома в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома, приступить к занятию зем. участка не позднее 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, осуществить строительство одноквартирного жилого дома в сроки, определенные ПСД, снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан).

Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке.

Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона (утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся). Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка.

Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

І ПОЎНЫ НАБОР ВОЛЬНАСЦЯЎ!

ВЕЛІЖ цяпер знаходзіцца ў складзе Расійскай Федэрацыі, а калісьці ён быў цесна звязаны з беларускімі землямі — уваходзіў у склад Віцебскага ваяводства, а пазней — Віцебскай губерні.

На замкавай гары

У сярэдзіне XIV стагоддзя наваколлі Веліжа былі далучаны да Вялікага Княства Літоўскага. У адміністрацыйным плане яны былі падпарадкаваны Віцебску.

У 1503 годзе паўночна-ўсходнія воласці Віцебскай зямлі, у тым ліку Веліжская, адышлі да Маскоўскай дзяржавы. Летам 1536 года, згодна з распараджэннем маскоўскіх уладаў, тут, на старым гарадзішчы, была ўзведзена магутная драўляная крэпасць. Гэты год і лічыцца афіцыйнай датай заснавання Веліжа. У пачатку жніўня 1580 года войскі караля Стэфана Баторыя занялі Веліж. І, паводле пунктаў Ям-Запольскага мірнага дагавора, заключанага ў студзені 1582 года, горад увайшоў у склад ВКЛ.

— Пераможаным веліжанам прапанавалі або выехаць у Маскву, або прысягнуць Баторыю і застацца ў родным горадзе. Многія скарысталіся каралеўскай прапановай. Таму «касцяк» насельніцтва пачатку «літоўскага» перыяду складаўся з тых жа людзей, што жылі тут да жніўня 1580 года, — расказвае **старшы навуковы супрацоўнік Навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Палітэхнік» Максім МАКАРАЎ.**

Спецыфіка веліжскага самакіравання

Большасць буйных і сярэдніх гарадоў ВКЛ характарызаваліся асобым прававым статусам. Не стаў выключэннем і нядаўна далучаны Веліж. З улікам спецыфікі рэгіёна ўлады заснавалі тут не агульнапрынятае ў ВКЛ Магдэбургскае права, а лакальную сістэму гарадскога права. Апошняе за некалькі дзесяцігоддзяў да гэтага аформілася на аснове земскага права Віцебшчыны і атрымала распаўсюджанне на землях Падзвіння: у Віцебску, Суражы, Уле. У яго рамках мяшчанам гарантаваліся правы: на выбар войта, бязмытны гандаль на тэрыторыі ВКЛ, правядзенне некалькіх кірмашоў у год, свабоднае распараджэнне сваёй рухомай і нерухомай маёмасцю, свабоду выбару месца жыхарства ў межах дзяржавы. У рамках «віцебскай мадэлі» найбольш істотным было тое, што мяшчане вызваляліся ад шэрагу падаткаў. А іх асноўнай павіннасцю было нясенне прэстыжнай коннай вайсковай службы.

Абавязак — плаціць «чынш» і будаваць замак

7 снежня 1582 года Стэфан Баторый сваім лістом паведаміў ваяводзе віцебскаму Станіславу Пацу пра наданне Веліжу такіх жа правоў, якімі на той момант карысталіся мяшчане Віцебска і Суража. Аднак пра веліжскі прывілей 1582 г. нічога не вядома. І, мабыць, да 1585 года такі дакумент увогуле не быў створаны. Лівонская вайна скончылася, неабходнасць у вайсковай службе мяшчан адпала. Адносіны з гандлёва-рамесным саслоўем трэба было ізноў пераводзіць у эканамічную сферу. У выніку вырашэнне пытання аб прававым статусе Веліжа было адкладзена на некалькі гадоў.

— І толькі 20 сакавіка 1585 года Стэфан Баторый надаў Веліжу першы прывілей. Згодна з дакументам мяшчане былі абавязаны плаціць «чынш» (ад падатку) у дзяржаўны скарб за карыстанне гарадскімі землямі, будаваць умацаванні замка і, як цікава чытаць сёння, «даваць падводы каралеўскім паслам». Ад выканання гэтых павіннасцяў на карысць старасты веліжскага яны былі вызвалены, — працягвае даследчык.

